Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ЧЭРВЕНЯ 2014 г. СУБОТА № 105 (27715) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

РАСКЛАД РУХУ

пасажырскіх цягнікоў па станцыі Мінск-Пасажырскі 2014—2015 год

ЦАНА «КВАДРАТА»

У 2014—2016 гадах будзе праведзены эксперымент пры вызначэнні кошту будаўніцтва жылля па дзяржзаказе для льготнікаў

Гэта прадугледжана Указам № 270 «Аб рэалізацыі праграм дзяржаўнага заказу на будаўніцтва жылля», які падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Дакумент падпісаны ў мэтах аптымізацыі затрат на будаўніцтва жылля, устанаўлення цэн, зразумелых для будаўнікоў і насельніцтва, паведамляе БЕЛТА.

Указам прадугледжана, што ў 2014—2016 гадах у парадку эксперыменту пры рэалізацыі праграм дзяржаўнага заказу на будаўніцтва кватэр для грамадзян, маючых права на атрыманне льготных крэдытаў, кошт будаўніцтва жылога дома і максімальны памер ільготнага крэдыту будуць вызначацца зыходзячы з кошту квадратнага метра агульнай плошчы жылога дома, роўнай прагнознаму паказчыку намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай платы работніка ў месяц прыёмкі ў эксплуатацыю жылога дома (з улікам нарматыўнай працягласці будаўніцтва), з прымяненнем каэфіцыента 1,2.

Жылыя дамы, якія прадугледжваецца ўзводзіць згодна з эксперыментам, будуць адбірацца з пераліку эканамічных жылых дамоў, уключаных у праграмы дзяржаўнага заказу. Заказчыкамі будаўніцтва такіх дамоў будуць камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы па капітальным будаўніцтве. Крэдытныя сродкі будуць пералічвацца на спецыяльны рахунак заказчыка, што адкрываецца для будаўніцтва кожнага жылога дома.

Перавышэнне (зніжэнне) фактычных затрат, панесеных заказчыкам на будаўніцтва жылога дома, адносна задэкларанага ім, а таксама падлягаючага аплаце грамадзянамі на аснове дагавораў куплі-продажу кошту жылых памяшканняў (кватэр) будзе адносіцца на фінансавыя вынікі дзейнасці заказчыка. Сэканомленыя сродкі заказчык зможа накіроўваць на фінансаванне будаўніцтва наступных жылых дамоў па дзяржаўным заказе.

З кожным грамадзянінам будзе заключацца дагавор куплі-продажу па тым жа кошце квадратнага метра, па якім будзе выдавацца крэдыт заказчыку.

Максімальны памер ільготнага крэдыту для грамадзян на набыццё жылых памяшканняў не павінен перавышаць 90 працэнтаў (для шматдзетных сем'яў — 100 працэнтаў) кошту набыцця нарміруемых памераў агульнай плошчы жылога памяшкання.

У гэтым выпадку «жыллёвыя» крэдыты прадастаўляюцца чаргавікам на тэрмін да 15 гадоў, з выплатай 37,5% гадавых за фактычны час карыстання крэдытам. Максімальная сума крэдыту складае да 75% кошту набыцця жылога памяшкання (для шматдзетных сем'яў, якія маюць траіх і больш непаўналетніх дзяцей — 95%) у межах плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка. Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць у кантакт-цэнтры Беларусбанка па тэлефоне 147, а таксама ў любым аддзяленні банка.

Сяргей КУРКАЧ.

АДНАЎЛЯЕЦЦА КРЭДЫТАВАННЕ НА ЖЫЛЛЁ ПА ДЗЯРЖЗАКАЗЕ

Найбуйнейшы банк краіны з 9 чэрвеня зноў будзе ажыццяўляць выдачу крэдытаў фізічным асобам на набыццё жылых памяшканняў, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Беларусбанка.

Спецыялісты фінансавай установы ўдакладнілі: скарыстацца такім крэдытам могуць грамадзяне, якія заключылі дагаворы куплі-продажу жылых памяшканняў, што былі пабудаваны па дзяржаўным заказе ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 215 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні будаўніцтва (узвядзення, рэканструкцыі) жылых памяшканняў».

Сакатлівая гаспадарка

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Адна з самых любімых выставак, якую з задавальненнем наведваюць жыхары і госці сталіцы, — «Белагра». Сёлета яна зноў здзіўляе дасягненнямі і навінкамі сельскагаспадарчай вытворчасці.

НА ФОТАЗДЫМКУ: навуковыя супрацоўнікі Заслаўскага племяннога птушказавода Таццяна ВАШКЕВІЧ і Анатоль РАТКЕВІЧ дэманструюць птушак беларускай селекцыі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Юрый ДАРАГАКУПЕЦ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве:

«Сёння часта атрымліваецца так, што праблемы ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы вырашаюцца толькі тады, калі паскардзяцца жыхары, але гэта няправільна. Праблемнымі момантамі трэба займацца незалежна ад таго, паступаюць скаргі ці не. І гэтым, у прынцыпе, можа займацца асобны спецыялізаваны орган. Ствараць гэтую кантралюючую структуру, думаецца, лепш за ўсё на базе існуючай арганізацыі — напрыклад, Дзяржбуднагляду, дзе ўжо напрацавана пэўная база. Гэтая інспекцыя будзе кантраляваць не толькі ўтрыманне жылфонду, але і ажыццяўляць кантроль за аказанне жыллёва-камунальных паслуг, рэгуляваць, наколькі яны адпавядаюць сацыяльным стандартам».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.06.2014 г.

Долар ЗША	10130,00	▲
Еўра	13820,00	▲
Рас. руб.	292,50	▲
Укр. грыўня	853,05	▼

■ Тэма дня

У палях горача

Тэма павышэння якасці кармоў неаднойчы абмяркоўвалася на самым высокім узроўні. Невыпадкова яна аказалася ў цэнтры ўвагі і падчас нядаўняй рабочай паездкі Прэзідэнта ў Мінскую вобласць — ад кармоў наўпрост залежыць вытворчасць жывёлагадоўчай прадукцыі. Таму і пачатак лета для сельгаспрадпрыемстваў выдаўся сапраўды гарачым. Першы ўкос траў павінен быць завершаны ўжо днямі ва ўсіх рэгіёнах, акрамя самага паўночнага — Віцебшчыны, якой дазволена невялікая адтэрміноўка.

Як ідзе нарыхтоўка кармоў у рэгіёнах краіны, пацікавіліся нашы карэспандэнты. СТАР. 2

Фота БЕЛТА.

■ Экаасяроддзе

АДХОДЫ ПАТРАБУЮЦЬ РЭФОРМАЎ

У трох рэгіёнах Беларусі (Браслаўскім раёне, Жлобіне і Бабруйску) запушчаны пілотныя праекты па менеджменце адходаў электрычнага і электроннага абсталявання. Яны накіраваны на стварэнне ў краіне эфектыўнай сістэмы збору і ўтылізацыі гэтага тыпу адходаў.

Сметнік — не выйсце

Куды падзець стары тэлевізар з кінескопам, зламаны мабільнік ці халадзільнік, што адпрацаваў сваё? Красамоўныя адказы на гэтае пытанне можна ўбачыць штодня каля сметнікаў, дзе такое непатрэбнае «багацце» ляжыць па некалькі тыдняў, а то і месяцаў. Эколагі б'юць трывогу аб наступствах: напрыклад, той жа кінескоп змяшчае ў сабе да 2 кілаграмаў свінцу, які трапляе ў глебу і забруджвае яе. Халадзільнікі становяцца прычынай разбурэння азонавага слою, бо ў іх ёсць фрэоны. Глеба і вада моцна забруджваюцца ўстойлівымі арганічнымі забруджвальнікамі і цяжкімі металамі нават на палігонах, дзе захоўваюцца адходы. Тым не менш колькасць адходаў электрычнага і электроннага абсталявання (далей — ЭЭА) з кожным днём павялічваецца. Прычына — празмерная вытворчасць і залішняе спажыванне электронных тавараў. Цэнтр экалагічных рашэнняў пры падтрымцы галандскай кампаніі STIDIT і праграмы малых грантаў Глабальнага экалагічнага фонду запусціў пілотныя праекты па стварэнні якаснай сістэмы менеджменту адходаў у трох беларускіх рэгіёнах.

Еўрапейскі падыход

У Еўрапейскім саюзе даўно працуюць з адходамі ЭЭА, таму сістэма наладжана добра. Пра нідэрландскі вопыт па гэтым пытанні распавяла **Вілма ВЕНЕКЕНС, менеджар праектаў арганізацыі STIDIT.** «У ЕС дзейнічае дырэктыва ROHS, якая абмяжоўвае выкарыстанне шасці шкодных рэчываў пры вытворчасці ЭЭА, сярод якіх свінец, ртуць і кадмій. Вытворцы і імпарцёры прадукцыі ў абавязковым парадку павінны збіраць, прымаць ад насельніцтва старое абсталяванне і перапрацоўваць адходы, — падкрэсліла Вілма. — Такім чынам, у кошт тавару ўжо ўнесена сума за расходы на збор і перапрацоўку. Раней яе можна было ўбачыць на чэках».

У Нідэрландах існуе нацыянальная арганізацыя па зборы і перапрацоўцы адходаў ЭЭА Wecycle, якая фінансуецца вытворцамі і імпарцёрамі. СТАР. 3

ДРЭВЫ ДРУЖБЫ Ў КАЛОЖСКІМ ПАРКУ

Пачатак алеі дружбы быў пакладзены ўчора, у першы дзень заключнага этапу X Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, у Каложскім парку горада над Нёманам.

Разам з арганізатарамі свята гэтую пачэсную місію выканалі прадстаўнікі ўсіх нацыянальных суполак, якія сабраліся ў Гродне. Яны пасадзілі каля сарака дрэў, у тым ліку і даволі экзатычных для нашай мясцовасці: міндаль, магнолію, гінкга, катальпа, цюльпанавае і аксамітнае дрэвы,кедравую сасну... Спецыялісты «Гродназелянбуда» пры выбары парод стараліся прадставіць флору розных краін — з улікам, зразумела, іх адаптацыі да нашых кліматычных умоў.

У першы фестывальны дзень былі таксама прэзентаваны дзве фотавыставы: «Беларусь шматнацыянальная» (падрыхтавана апаратам Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь) і «У аб'ектыве — старонкі гісторыі фестывалю нацыянальных культур». Былі ўзнагароджаны лаўрэаты рэспубліканскага конкурсу сярод журналістаў і СМІ на лепшае асвятленне міжнацыянальных і міжканфесіянальных адносін, міжнароднага дыялогу нашай краіны і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой. А ў 21 гадзіну пачалося тэатралізаванае шэсце ўдзельнікаў фестывалю па вуліцах Гродна, пасля чаго адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця свята, а затым — канцэрт прафесійных беларускіх артыстаў розных нацыянальнасцяў, святочны феерверк і шоу-праграма з удзелам зорак замежнай эстрады.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

VODAFONE РАСПАВЁЎ АБ ПРАСЛУХОЎВАННІ ТЭЛЕФОНАЎ У 29 КРАІНАХ СВЕТУ

Брытанскі сотавы аператар Vodafone апублікаваў справаздачу, у якой паведамляецца аб праслухоўванні тэлефонных размоў карыстальнікаў у 29 краінах свету. Прычым, згодна з дакладам, у шасці з іх улады маюць прамы пастаянны доступ да інфармацыі, якая захоўваецца ўнутры сеткі, піша The Financial Times. У справаздачы Vodafone не акрэслена, якія менавіта гэта краіны, па юрыдычных прычынах. Акрамя таго, у кампаніі адзначылі, што ўлады некаторых краін звяртаюцца да іх з просьбай аб перадачы інфармацыі аб карыстальніках для правядзення расследаванняў. У прыватнасці, з іх дапамогай з'яўляецца магчымасць выявіць месцазнаходжанне асоб, якія адшукваюцца. Аналагічныя справаздачы таксама публікуюць такія кампаніі, як AT&T, Verizon і Deutsche Telekom.

У РАСІІ ЗАБАРОНЯЦЬ АЛКАГОЛЬ ПА ВЫХАДНЫХ?

Расійскія і замежныя эксперты па дэмаграфічнай сітуацыі пры ўрадзе краіны прапануюць забараніць продаж алкагольных напояў з колькасцю этанолу больш за 15% па нядзелях, а таксама па суботах пасля 16.00. «Гэтая мера выдатна паказала сябе ў скандынаўскіх краінах, і яе неабходна як мага хутчэй укараняць у Расіі», — гаворыцца ў дакладзе «Праз 10 гадоў будзе позна». Урадавая група экспертаў ужо знайшла падтрымку ў апараце прэм'ера і ў сенатараў.

ГАЛАДАННЕ ПЕРАЗАГРУЖАЕ ІМУННУЮ СІСТЭМУ ЧАЛАВЕКА

Універсітэт Паўднёвай Каліфорніі апублікаваў нечаканае даследаванне. Аказваецца, рэгулярныя, але абмежаваныя па часе перыяды галадання, якія доўжацца не больш за 4 дні, аднаўляюць імунную сістэму. У людзей павышаецца ўзровень лейкацытаў.

Прычым галаданне можа быць асабліва эфектыўным для людзей з аслабленай імуннай сістэмай — напрыклад, для ракавых хворых. Таксама часовая адмова ад ежы нівеліруе пабочныя эфекты хіміятэрапіі. Падчас галадання сталавыя клеткі, якія знаходзяцца ў целе, пачынаюць прадуцыраваць лейкацыты, регенерыруючы ўсю імунную сістэму ў цэлым. Адбываецца гэта з-за таго, што цела ва ўмовах голаду спрабуе захаваць максімальную колькасць энергіі. «Пабочны эфект» гэтага працэсу — пазбаўленне ад старых, слабых або пашкоджаных імунных клетак. Характэрна: раней спецыялісты катэгарычна забаранялі галадаць хворым людзям.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

АРЫШТАВАНЫ ЗАБОЙЦА ПАЛІЦЭЙСКІХ

У Канадзе ў ноч на пятніцу арыштаваны мужчына, які падазраецца ў забойстве траіх паліцэйскіх. У аперацыі ўдзельнічалі некалькі соцень праваахоўнікаў. На яе час у горадзе былі часова закрыты школы і муніцыпальныя ўстановы. Акрамя таго, паліцыя прасіла мясцовых жыхароў не пакідаць свае дамы. У чацвер, 5 чэрвеня, Бурк, узброены дзвюма стрэльбамі і апрануты ў камуфляжную форму, учыніў стралянінў ў горадзе Манктон на ўсходзе Канады. У выніку загінулі трое паліцэйскіх, а двое былі шпіталізаваны з цяжкімі раненнямі. Аб матывах злачынства нічога не вядома. Суседзі расказваюць, што Брук быў заўзятым калекцыянерам зброі, а таксама аматарам палявання.

КАРАТКА

Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях (ДКНТ) Беларусі плануе выплачваць па $10 тыс. пераможцам рэспубліканскага конкурсу інавацыйных праектаў.

Продаж звыш 26,2 т прадуктаў (кандытарскіх вырабаў, сухафруктаў, кансерваванай прадукцыі і іншых) і каля 38,6 тыс. тавараў нехарчовай групы (цацак, вырабаў лёгкай прамысловасці, сродкаў асабістай гігіены і г.д.) быў забаронены органамі дзяржаўнага санітарнага нагляду Беларусі за студзень—май за невыкананне патрабаванняў, якія прадугледжаны пры абароце тавараў.

У рамках праекта «Летнія музычныя асамблеі-2014», які рэалізуе Гомельскі палацава-паркавы ансамбль пры падтрымцы гарвыканкама, адзін раз у два тыдні па нядзелях на працягу ўсяго летняга перыяду на пандусе палаца Румянцавых і Паскевічаў будуць іграць лепшыя аркестравыя калектывы горада.

Міністэрства гандлю Беларусі вядзе работу па прыцягненні ААТ «Алтайскі знахар» да адміністрацыйнай адказнасці за неналежную рэкламу сваёй прадукцыі, якая не зарэгістравана на тэрыторыі нашай краіны ў якасці лекавых сродкаў.

■ Заканадаўчая ініцыятыва

АБ ТЫХ, КАГО МЫ ПРЫРУЧЫЛІ

Законапраекту аб абыходжанні з жывёламі патрэбны медыятар

— Наталля Васільеўна, раскажыце, якая адказнасць за жорсткае абыходжанне з жывёлами прадугледжана ў існуючым заканадаўстве?

— У нашай краіне за гэта прадугледжана адміністрацыйная адказнасць, але, як паказвае практыка, гэтая норма не працуе, бо не папярэджвае такія небяспечныя для грамадства дзеянні, як жорсткае абыходжанне з жывёламі. Артыкул 15.45 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях прадугледжвае пакаранне за гібель, калецтва і катаванне жывёл у выглядзе штрафу ў памеры ад 10 да 30 базавых велічынь (сёння гэта ад 1,5 да 4,5 млн рублёў. — **«Зв.»**) альбо адміністрацыйны арышт.

Пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні за жорсткае абыходжанне з жывёламі складаюць выканаўчыя камітэты розных узроўняў. Натуральна, што звяртацца туды, калі людзі бачаць факт жорсткага абыходжання з жывёлай, нязручна, ды і самі супрацоўнікі выканкамаў не вельмі ахвотна складаюць такія пратаколы. Як правіла, яны выклікаюць грамадзяніна, які ўтрымлівае жывёліну, а той адмаўляе факт жорсткага абыходжання. СТАР. 2

Закон «Аб абыходжанні з жывёламі» беларускі парламент спрабаваў прыняць ужо тройчы на працягу апошніх 13 гадоў, і кожны раз праект быў адкліканы. Дэпутаты мінулага, чацвёртага, склікання, нарэшце, прынялі законапраект у першым чытанні, але так і не змаглі яго дапрацаваць да другога. Тым не менш у важнасці і тэрміновасці вызначэння прававых асноў абыходжання з жывёламі ў нашай краіне не сумняваецца, здаецца, ніхто: ні ўладальнікі чатырохногіх істот, ні іх суседзі, ні супрацоўнікі жыллёва-камунальных службаў, ні абаронцы жывёл, ні медыкі, ні крыміналісты, ні нават палітыкі. Пра тое, якія захады для ліквідацыі заканадаўчага прабелу робіць парламент пятага склікання, наша размова з членам Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве Наталляй ГУЙВІК (Полацкая гарадская акруга), якая прапанавала ў план работы парламента праект закона «Аб абыходжанні з жывёламі».

ВЫРАЗНІКІ ДУМАК НАРОДА

Саюзу пісьменнікаў Беларусі

Паважаныя сябры!

Сардэчна віншую вас з юбілеем — 80-годдзем з дня заснавання Саюза пісьменнікаў Беларусі.

На працягу гэтага часу створана надзвычай багатая пісьмовая спадчына. Творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Петруся Броўкі, Івана Мележа, Максіма Танка, Уладзіміра Караткевіча, Івана Шамякіна, а таксама сучасных аўтараў сталі здабыткам айчыннай і сусветнай літаратуры.

Беларускія пісьменнікі заўсёды з'яўляліся выразнікамі думак, пачуццяў і спадзяванняў свайго народа. Так было і ў перыяд ваеннага ліхалецця, і ў гады пасляваеннай адбудовы, і сёння. Таму вельмі важнай задачай застаецца патрыятычнае выхаванне грамадства, найперш маладога пакалення, на аснове традыцый гісторыі нацыянальнай культуры.

Ад усёй душы жадаю вам моцнага здароўя, новых яркіх адметных твораў, шчырай удзячнасці чытачоў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

«КАБ НАРАДЖАЛІСЯ КНІГІ, ЯКІЯ БУДУЦЬ ПРЫНОСІЦЬ РАДАСЦЬ»

Аб ролі пісьменніцкай суполкі сёння мы спыталі ў сучасных літаратараў

Мікалай ЧАРГІНЕЦ, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі:

— 80-годдзе СПБ — гэта значны этап у развіцці беларускай літаратуры. За гэты час у айчыннym пісьменстве з'явілася шмат найвыдатнейшых творцаў: Янка Купала, Якуб Колас, Іван Чыгрынаў, Андрэй Макаёнак, Максім Танк, Рыгор Барадулін, Васіль Быкаў ды многія іншыя. Цешыць, што і новы час нараджае таленавітых літаратараў. Згадаць хаця б Генадзя Пашкова, Міхася Пазнякова, Уладзіміра Гніламёдава, Анатоля Аўруціна, Алеся Бадака, Міколу Мятліцкага... Асабліва ж важна, што саюз падтрымлівае развіццё літаратуры ў рэгіёнах: у кожнай вобласці працуюць пісьменнікі пад старшынствам такіх адданых і руплівых дзеячаў, як Тамара Краснова-Гусачэнка, Анатоль Крэйдзіч, Уладзімір Гаўрыловіч, Людміла Кебіч, Уладзімір Дуктаў, Алесь Карлюкевіч. Сярод моладзі апошнім часам ярка заявілі пра сябе Маргарыта Латышкевіч, Рагнед Малахоўскі, Марыя Малиноўская, Дзмітрый Саўчык — здольныя не толькі прыгожа выкласці думкі на паперу, але і выказаць уласную думку, а потым несці за яе адказнасць. Яны — заўтрашні дзень нашай арганізацыі. Высокая ацэнка, дадзеная на адрас СПБ Прэзідэнтам нашай краіны, — вялікі гонар. Але гэта не азначае, што творцы павінны спачываць на лаўрах. Я заклікаю калег быць самакрытычнымі, адэкватна ацэньваць уласныя набыткі і не крыўдаваць на крытыку. Ад шчырага сэрца віншую ўсіх творцаў нашай краіны і нагадваю, што ўсе мы служым роднай Беларусі. Сваёй працай мы павінны імкнуцца найлепшым чынам прадстаўляць яе ва ўсім свеце. СПБ заключыў дагаворы аб супрацоўніцтве з 28 краінамі. Але галоўная наша мэта — стварэнне выдатнай літаратуры, якую з захапленнем будуць чытаць новыя пакаленні беларусаў!

Уладзімір КАРЫЗНА, пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь:

— Наша суполка — частка гісторыі. Пісьменнік заўжды быў той зоркай, на якую арыентаваліся, якой цікавіліся і за якой ішлі. Таму роля сучасных творцаў і літаратарскай суполкі ў тым, каб нараджаліся кнігі, якія будуць прыносіць радасць свайму чытачу, каб той, хто іх прачытаў, адчуў святло і цеплыню роднага слова і сваёй зямлі. Беларусь — краіна, моцная сваімі людзьмі. Менавіта пісьменнікі павінны дбаць пра тое, каб у народа быў настрой і для працы, і для адпачынку. Жыццё сёння няпростае, але, чытаючы вершы ў «ЛіМе», «Полымі», «Маладосці», «Нёмане», я радуюся, бо яны дораць мне адчуванне таго, чым жыве народ.

Іван САВЕРЧАНКА, доктар філалагічных навук, прафесар:

— Пісьменніцкая суполка выконвае вельмі важныя функцыі: найперш, яна з'яўляецца месцам абмену думкамі, тут творцы могуць аператыўна пазнаёміцца з навінкамі сучаснай літаратуры. Гэта ў пэўным сэнсе дыскусійны клуб, дзе часта адбываюцца спрэчкі пра стан літаратурнага жыцця. Надзвычай важна, што кіраўніцтва творчых суполак выконвае і значную арганізацыйную работу: ладзіць сустрэчы з чытачамі, рыхтуе літаратурныя вандроўкі, выконвае працу па вылучэнні пісьменнікаў на ўзнагароды.

Анатоль КРЭЙДЗІЧ, старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ:

— За гады існавання саюза ў літаратуру прыйшло шмат цікавых таленавітых творцаў. СПБ разам са сваімі абласнымі аддзяленнямі імкнецца падтрымаць кожнага, дапамагчы выдаць і распаўсюдзіць кнігу. А ў выніку мы ўзнімаем на новую вышыню ўсю нашу літаратуру. Вельмі шмат зроблена, і гэта было б немагчымым без падтрымкі дзяржавы — не толькі Прэзідэнта, але і мясцовых улад. Увогуле, беларускія пісьменнікі — шчаслівыя людзі: нам ёсць пра што пісаць і ёсць каму чытаць. А літаратура заўжды дапамагае жыць, працаваць і думаць!

Падрыхтавала Таццяна СІВЕЦ.

У ПАЛЯХ ГАРАЧА

ВІЦЕБШЧЫНА: неабходна набраць тэмп

У паўночным рэгіёне Беларусі на Віцебшчыне, паводле інфармацыі на 5 чэрвеня, нарыхтавалі больш як 1/5 траў першага ўкосу. У аблвыканкаме настроены аптымістычна: робіцца ўсё магчымае, каб паспець з укосам своечасова. Толькі б не дажджы! Тым больш што Віцебскай вобласці, улічваючы асаблівасці кліматычных умоў, дадзена заданне выканаць адпаведны план не да 7 чэрвеня, а пазней.

Паводле інфармацыі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці, укос ідзе не без праблем. Калі ў некаторых раёнах уборка ажыццяўляецца своечасова, іншыя, на жаль, не могуць набраць неабходны тэмп.

— Напрыклад, вельмі нізкімі тэмпамі вядзецца ўборка траў у сельскагаспадарчых арганізацыях Браслаўскага раёна (16,3% да планавага задання), а таксама ў Мёрскім (19,1%) і Докшыцкім (20,2%) раёнах. Асноўны фактар, які стрымлівае ход уборкі траў першага ўкосу, — недахоп сродкаў у сельскагаспадарчых арганізацыях на закупку дызельнага паліва ў неабходнай колькасці, — расказалі ў кантрольным ведамстве.

А ў Камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама адзначылі лідараў па нарыхтоўцы кармоў: Чашніцкі, Полацкі, Дубровенскі, Глыбоцкі, Расонскі раёны.

Спецыялісты канстатуюць, што сёлета травы ўрадзіліся добрыя. Для кожнай жывёлы, якую будуць карміць травой, плануюць нарыхтаваць як мінімум 16 цэнтнераў кармоў з першага ўкосу.

Аляксандр Косінец, старшыня Віцебскага аблвыканкама, нядаўна нагадаў, што прайшоў час, калі на Віцебшчыну завозілі кармы з іншых абласцей краіны. Вобласць цяпер мае тэхніку для нарыхтоўкі кармоў у колькасці не меншай, чым іншыя. Усім гаспадаркам дадзена заданне на 100% забяспечыць кароў кармамі.

ГОМЕЛЬШЧЫНА: скасіць так, каб не прамарудзіць

Сёлетняя касавіца на Гомельшчыне пачалася трохі раней, чым звычайна. Спецыялісты камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама гавораць, што дзякучы надвор'ю, а таксама своечасоваму догляду, травы выраслі добрыя, перастаяць не паспелі, і іх нарыхтоўка ідзе рытмічна.

Праўда, дажджы, якія не забываюць гэтым летам паўднёва-ўсходнюю вобласць краіны, ствараюць некаторыя асаблівасці — у тым ліку ў пераразмеркаванні відаў кармавых нарыхтовак. **Начальнік упраўлення раслінаводства камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Сяргей ДЗЕНІСЕНКА** тлумачыць, чаму нашмат больш рыхтуецца сенажу, чым сена:

— Ужо нарыхтавана сена 13 900 тон (7% да задання) і сенажу 352 тысячы тон (27%). Сёлета ў нас практычна праз дзень ідуць дажджы. Гаспадар, можа, і разлічваў спачатку ўбраць траву на сена. Але ж... Вось ляжыць пракос траў першага ўкосу — а тут дожджык. Назаўтра — пагода, падсохлую траву падварушылі, узбілі ў валочак. А вечарам — другі дождж... Сена — не лён, трымаць пад дажджом доўга нельга. Таму, пакуль не позна, яго адпраўляюць на сянаж. На 5 чэрвеня травы першага ўкосу скошаны на плошчы 130 тысяч га — гэта 76% ад плошчы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота БЕЛТА.

Па новай тэхналогіі вядуць нарыхтоўку сенажу ў СВУ «Антонаўка-Агра» Жлобінскага раёна. Прагрэсіўная тэхналогія дазваляе тут жа на полі пакаваць сянаж у поліэтыленавыя цюкі вагой 600-700 кг. На здымку: адказны за якасць нарыхтоўкі кармоў, галоўны ветурач нарны ўрач Жлобінскага раёна Дзмітрый КОЗЕЛ і ветэрынар-таксіколаг Тамара СЛЕНЗАК на полі кантралюючы узровень вільготнасці нарыхтаваных кармоў.

ком дзяржавы вызначаны даты завяршэння касьбы траў першага ўкосу для нашай зоны да 10 чэрвеня. Мы павінны скасіць з такім разлікам, каб не прамарудзіць аптымальныя тэрміны паспявання — каб трава не перастаяла. Можна сказаць, што на Гомельшчыне сёння нармальная рабочая сітуацыя. Да 10 чэрвеня калі крыху і не завершым, дык будзем вельмі блізкія да фіналу касавіцы.

МІНШЧЫНА: адменены ўсе водпускі і камандзіроўкі

Спачатку планавалася, што з першага ўкосу траў тут будуць нарыхтоўваць у асноўным сена. Але гэта не ўдалося у поўнай меры па прычыне неспрыяльных умоў надвор'я, расказаў **начальнік аддзела па земляробстве і раслінаводстве Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінаблвыканкама Сяргей ПРЫМАЧЭНКА.**

— Паралельна нарыхтоўваем сянаж: у палімерную стрэйч-плёнку мяркуецца запакаваць яго каля 250 тыс. тон, што цалкам магчыма нават пры такім надвор'і. Справа ў тым, што па тэхналогіі дапускаецца вільготнасць травы 60-65%.

Разам з тым робіцца ўсё неабходнае для атрымання паўнавартасных травяных кармоў другога ўкосу: аператыўна ўбіраюцца палі, падкормліваюцца вызваленыя плошчы. На думку Сяргея Прымачэнкі, для росту траў ёсць усе перадумовы: цёплае вільготнае надвор'е стварае парніковы эфект, што найлепшым чынам уплывае на ўрадлівасць. А гэта, у сваю чаргу, дасць магчымасць нарыхтаваць неабходную колькасць сена. Як адзначыў мой суразмоўца, недзе праз 30-40 дзён, а ў асобных раёнах і гаспадарках і раней — у залежнасці ад травастою — прыступяць да другога укосу. Паралельна працуюць на Міншчыне і з малапрадукцыйнымі палямі, пры засмечанасці непатрэбнымі раслінамі на 30-40% плошчы заворваюць.

На сённяшні дзень, як лічаць спецыялісты, касавіца адпавядае раней запланаваным тэмпам: выкарыстоўваецца кожная спрыяльная гадзіна для таго, каб падабраць скошаныя раней травы. Надвор'е паляпшаецца і адпаведна тэмпы касавіцы павялічваюцца.

— Калі ў дажджлівыя дні скошвалі 5 тыс. гектараў па вобласці, то цяпер — 12 тысяч. Паўднёвыя раёны набліжаюцца да завяршэння ўборкі. У прыватнасці, у Нясвіжскім і Салігорскім раёнах нарыхтавана па 75% кармоў, у Слуцкім — 60%, Чэрвеньскім — 63%, Любанскім — 59% ад запланаванага, — канстатуе **намеснік начальніка аддзела па земляробстве і раслінаводстве Юлія СКЛАДАНОЎСКАЯ.** — Мяркую, што з работай тут павінны справіцца да 9 чэрвеня.

Губернатар Мінскай вобласці паставіў задачу падчас нарыхтоўкі траў максімальна задзейнічаць 9-метровыя жняркі. Яны дазваляюць аптымізаваць суадносіны якасці і колькасці кармоў. Інакш кажучы, скошваюць роўна столькі плошчаў, колькі патрэбна для закладкі сянажнай ямы ў гаспадарцы на працягу трох дзён. А наогул, у цэнтральным рэгіёне дастаткова неабходнай тэхнікі, у тым ліку і новай, каб завяршыць уборку. Максімальна задзейнічаны і людзі, якія выходзяць у поле пры кожнай спрыяльнай ад дажджоў хвіліне. У сувязі з гарачай парой Мінская вобласць нават адмовілася ад удзелу ў міжнароднай спецыялізаванай выставе «БелАгра-2014».

На перыяд нарыхтоўкі кармоў адменены ўсе водпускі і замежныя камандзіроўкі кіраўнікоў і іх намеснікаў, адказных спецыялістаў райвыканкамаў, сельскагаспадарчых арганізацый. У вобласці сфарміравана рабочая група на чале з намеснікам прэм'ер-міністра Анатолем Тозікам, якая кантралюе правядзенне ўборкі траў першага ўкосу ў строгай адпаведнасці з тэхналогіямі і рэкамендацыямі вучоных.

Ірына АСТАШКЕВІЧ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У 2012 годзе распрацоўшчыкі законапраекта проста не вытрымалі націску абаронцаў жывёл. У прычынах адклікання такая фармулёўка: грамадства не падрыхтавана да прыняцця прапісаных у законапраекце нормаў. Але ў чым грамадства не падрыхтавана?

Я згодна з думкай індыйскага філосафа Махатмы Гандзі пра тое, што вялікасць і маральны прагрэс нацыі можна вымераць тым, як гэта нацыя ставіцца да жывёл.

— Да таго ж даўно заўважана ўзаемасувязь паміж жорсткімі злачынствамі супраць людзей і садызмам у дачыненні да жывёл...

— Сучасныя псіхалогія і крыміналогія пераканаўча паказваюць гэтую ўзаемасувязь. Жорсткасць у дачыненні да жывёл садзейнічае фарміраванню пачуцця абыякавасці да пакут жывых істот, нараджае агрэсіўнасць і гвалтоўнасць да навакольных. Гэта ўплывае на свядомасць тых, хто непасрэдна здзяйсняе жорсткія дзеянні, і тых, хто аказваецца іх відавочцамі.

— Тое, што «мінская скуралупа», які пакалечыў і забіў дзясятак жывёл восенню мінулага года, так і не знайшлі, — тоіць патэнцыйную небяспеку для людзей?

— Безумоўна. І самае страшнае — ёсць сведчанні, што такі нелюдзь у Беларусі не адзін. На пачатку гэтага года ў пасёлку Лужасна пад Віцебскам нехта надзеў на пашчу сабакі маску з дроту, якая нанесла ёй жудасныя раны, не давала магчымасці есці і піць...

— Магчыма, пасля гэтых выпадкаў на ініцыятыву ўвесці крымінальную адказнасць за жорсткае абыходжанне з жывёламі грамадства паглядзіць інакш.

— Неапраўдана высокая цана. Калі б законапраект быў прыняты, магчыма, гэтых выпадкаў не было б. Цяпер дэпутаты прапануюць дапоўніць Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь артыкулам 339-1, які складаецца з дзвюх частак. Першая прадугледжвае пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ, штрафу, папраўчых работ, арышту за жорсткае абыходжанне з жывёламі, якое выклікала гібель або калецтва і было здзейснена з-за хуліганскіх, карыслівых або іншых нізкіх памкненняў альбо ў прысутнасці малалетняга. Калі гэтыя ж дзеянні здзейснены паўторна альбо групай асоб, то санкцыя часткі другой гэтага артыкула будзе прадугледжваць пакаранне ў выглядзе арышту, абмежавання волі на тэрмін да аднаго года або пазбаўлення волі на той жа тэрмін.

— Чым хуліганства адрозніваецца ад нізкіх памкненняў?

— Хуліганства — гэта адкрытае выказванне непавагі да ўсталяваных нормаў, парушэнне грамадскага парадку, выклік маралі. А нізкія памкненні, як правіла, не дэманструюць.

Абнадзейвае тое, што цяпер большасць дзяржаўных органаў, меркаванне якіх высвятлялі, выказаліся за неабходнасць прыняцця асобнага заканадаўчага акта, які рэгулюе пытанні абыходжання з жывёламі. Адміністрацыя Прэзідэнта таксама падтрымлівае гэтую пазіцыю. Так што цалкам магчыма, што дэпутаты Палаты прадстаўнікоў 5-га склікання паспеюць прыняць гэты вельмі важны для нашага грамадства закон.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

■ Медыяпрастора

ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ СТВАРЭННЯ НОВЫХ ІДЭЙ

У панядзелак, 9 чэрвеня, у Мінску стартуе IX Беларускі міжнародны медыяфорум

З першых гадоў свайго існавання форум зарэкамендаваў сябе як унікальная дыскусійная пляцоўка для абмену меркаваннямі і выпрацоўкі новых ідэй і канцэпцый з удзелам экспертна-медыйнай суполкі краін СНД, блізкага і далёкага замежжа.

Тэма сёлетняй сустрэчы — «Партнёрства ў імя будучыні: рэаліі глабальнага свету». У папярэднія гады ўдзельнікі форуму разглядалі гісторыка-культурную спадчыну як фактар яднання, вывучалі мадэлі новай эпохі, фарміравалі сацыяльныя ўстаноўкі падчас глабальнага эканамічнага крызісу, шукалі інструменты супрацьдзеяння выклікам XXI стагоддзя.

Штогод форум збірае звыш 500 чалавек, сярод якіх каля 100 замежных прадстаўнікоў — дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, экспертаў, палітолагаў, дзеячаў навукі і культуры, прадстаўнікоў вядучых сродкаў масавай інфармацыі. Сёлета чакаецца ўдзел прадстаўнікоў з 26 краін свету.

Праграма IX медыяфоруму прадугледжвае выязныя эксперт-сесіі, ускладанне вянка да манумента на плошчы Перамогі, наведванне гісторыка-культурнага комплексу «Лінія Сталіна», выстаўкі, прысвечаныя гісторыі Мінска і Першай сусветнай вайне, дэфіле ўзорна-паказальнага аркестра Узброеных Сіл Беларусі. Безумоўна, будзе і традыцыйная летняя школа журналістыкі, якая прадугледжвае майстар-класы вядучых журналістаў Беларусі і краін Еўразіі.

Падчас пленарнага пасяджэння плануецца правядзенне дзвюх панэльных сесій, прысвечаных ролі міжнароднай суполкі ў папярэджанні канфліктаў і войнаў і стварэнню Еўразійскага эканамічнага саюза.

Форум праводзіцца пры падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы, Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД, шэрагу міністэрстваў Расіі і Беларусі, Выканаўчага камітэта СНД, Інстытута журналістыкі БДУ, Мінскага гарадскога і абласнога выканкамаў, Беларускага саюза журналістаў і Аналітычнага цэнтра EcooM.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

ЗЛАЧЫНСТВЫ РАСКРЫЛІ ПА ГАРАЧЫХ СЛЯДАХ

У Мінску прайшоў гарнізонны інструктаж супрацоўнікаў усіх падраздзяленняў сталічнай міліцыі, якія заступілі на ахову грамадскага парадку.

Як паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама, адметнай рысай гэтага інструктажу стала ўзнагароджванне спецыялістаў, якія забяспечвалі парадак у сталіцы падчас чэмпіянату свету па хакеі. **Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў Беларусі,** уручыў амаль 50 супрацоўнікам граматы і падзякі.

— Такім чынам мы ўшанавалі тых, хто найбольш вызначыўся сваёй службай, — падкрэсліў міністр пасля мерапрыемства. — На працягу першынства мы працавалі даволі напружана, але эфектыўна. Пра гэта сведчыць і тое, што мы забяспечылі грамадскі парадак. Усе злачынствы, а іх было не так шмат, раскрылі па гарачых слядах. Падкрэслю, сваю работу мы імкнуліся праводзіць незаўважна і якасна.

Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара.

■ Ну і ну!

ДЗЯВОЧЫЯ ДЖЫНСЫ ПАД... МУЖЧЫНСКІМІ ШТАНАМІ

У рэспубліканскім пункце мытнага афармлення «Брузгі-2» увагу супрацоўніка мытні прыцягнулі двое беларускіх грамадзян, які пешшу вярталіся з Польшчы па «зялёным» калідоры. І вось што высветлілася.

Пасля перасячэння лініі выхаду з «зялёнага» калідора аднаму з пешаходаў прапанавалі прайсці дадатковы мытны кантроль. У выніку пад майкай і штанамі маладога чалавека было выяўлена (цяжка паверыць, але факт) 54 адзінкі тавару. І якога? Дзявочыя джынсы і жаночыя фуфайкі.

Другога пешахода інспектар мытні перавёў з «зялёнага» на «чырвоны» канал для дэкларавання багажу. Дадатковы мытны кантроль паказаў, што парушальніца схавала пад курткай 30 штук... мужчынскіх плавак і жаночых шортаў.

Такім чынам, у двух чалавек выявілі 84 адзінкі незадэкларованага тавару — рознага колеру, мадэляў і памераў. Аказалася, што ўсё гэта было атрымана ў Польшчы для перасячэння мяжы за матэрыяльнае ўзнагароджванне. Тавар агульным коштам больш за 10 мільёнаў рублёў у парушальнікаў, зразумела, адабралі і распачалі адміністрацыйны працэс, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Гродзенскай рэгіянальнай мытні.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

АБ ТЫХ, КАГО МЫ ПРЫРУЧЫЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пасля шматлікіх зваротаў выбаршчыкаў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў пятага склікання рыхтуюць змяненні і дапаўненні ў Крымінальны кодэкс, Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях аб узмацненні адказнасці за жорсткае абыходжанне з жывёламі і аб наданні службовым асобам Міністэрства ўнутраных спраў права складаць пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэнні за здзяйсненне такіх дзеянняў. У міліцыі больш паўнамоцтваў. Яны на месцы могуць устанавіць усе абставіны.

— Калі я аднойчы ў спёку ўбачыла у прыпаркаванай зачыненай машыне сабаку, то пазваніла ў міліцыю. Мне нават у галаву не прыйшло званіць у выканкам або ЖЭС.

— Гэта натуральная рэакцыя. Наша парламенцкая камісія імкнецца ўпэўніць Міністэрства ўнутраных спраў, што матыў жорсткага абыходжання з жывёламі — хуліганства. У першую чаргу, парушаецца грамадскі парадак, зневажаецца мараль, бо часцей гэта адбываецца на вачах іншых людзей. Таму мы прапануем даць міліцыі паўнамоцтвы на складанне пратаколаў па артыкуле 15.45 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Нават калі гэта адбываецца не навідавоку, міліцыі лягчэй прыняць меры супрацьдзеяння. А выканкамы часта пераводзяць стрэлкі на домаўпраўленні. Вось чаму за мінулы год па гэтым артыкуле былі прыцягнуты да адказнасці толькі 33 чалавекі з усёй Беларусі.

Жорсткасць у дачыненні да жывёл садзейнічае фарміраванню пачуцця абыякавасці да пакут жывых істот, нараджае агрэсіўнасць і гвалтоўнасць да навакольных.

На мой погляд, распрацаваны дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў чацвёртага склікання законапраект «Аб абыходжанні з жывёламі» быў цалкам дакладны, зразумелы і адпавядаў патрабаванням часу. Яго трэба было толькі дапрацаваць да другога чытання і потым, з улікам практыкі прымянення, удасканаліць.

— Але гэтага не здарылася. Чаму законапраект быў зноў адкліканы?

— На жаль, яго адклікалі з-за немагчымасці ўзгаднення пазіцый зоаабаронцаў і распрацоўшчыкаў дакумента. На той момант таксама не знайшла падтрымку ў Генпракуратуры ініцыятыва дэпутатаў аб увядзенні нормы, якая прадугледжвае крымінальную адказнасць за жорсткае абыходжанне з жывёламі. Яна была ўключана падчас падрыхтоўкі праекта да другога чытання.

— Якія нормы аказаліся найбольш спрэчнымі?

— Першая — па колькасці жывёл, якіх дазволена ўтрымліваць у кватэры шматкватэрнага дома. Распрацоўшчыкі прапаноўвалі не больш за двух. Мяркую, гэта лагічна і разумна, бо такая колькасць не будзе замінаць суседзям. Сёння ў невялікіх гарадскіх кватэрах ставяць клеткі і разводзяць катоў і сабак на продаж, і няма на гэта ніякай управы.

З гэтай нормай, у першую чаргу, не згодны тыя, хто робіць на развядзенні жывёл бізнес. Але спецыялісты прызнаюць, што больш за двух жывёл, як і прадстаўнікоў некаторых пародаў, лепш утрымліваць у прыватным доме, ва ўмовах свабоднага выгулу альбо вальера. Ва ўласным доме з падворкам можна трымаць любую колькасць хатніх любімцаў.

Другая спрэчная норма датычылася чыпавання. Я згодна з тым пунктам гледжання, што ніводны закон не будзе працаваць, калі не будзе праведзена работа па ўліку жывёл. У нас кожны чалавек мае ідэнтыфікацыйны нумар. А колькі жывёл, каму яны належалі ці належаць, — ніхто не ведае.

Калі ўсе чатырохногія кампаньёны чалавека будуць улічаны, тады ў нас не будзе бяздомных сабак і кошак, бо закон прадугледзіць адказнасць уладальнікаў за іх утрыманне. Супраць гэтай нормы таксама выступілі заводчыкі хатніх гадаванцаў, бо па-першае, гэта — адказнасць, па-другое — грошы, якія неабходна будзе заплаціць за чыпаванне.

— Што, на ваш погляд, трэба зрабіць, каб законапраект быў, нарэшце, прыняты?

— Ужо праз год пасля адклікання з парламента законапраекта «Аб абыходжанні з жывёламі» беларускае грамадства загаварыла аб неабходнасці яго прыняцця. Для яго дапрацоўкі неабходна знайсці залатую сярэдзіну, уключыць асновы медыятарства. Узначаліць працоўную групу па яго дапрацоўцы павінен чалавек, які будзе валодаць якасцямі прымірыцеля. У 2012 годзе распрацоўшчыкі законапраекта проста не вытрымалі націску абаронцаў жывёл. У прычынах адклікання такая фармулёўка: грамадства не падрыхтавана да прыняцця прапісаных у законапраекце нормаў. Але ў чым грамадства не падрыхтавана? Фінансаванне прытулкаў для жывёл не з'явіцца да таго часу, пакуль у законе не будзе прапісана стварэнне такіх прытулкаў...

У Віцебску, дарэчы, пры гарадской жыллёва-камунальнай гаспадарцы стварылі прытулак для бяздомных жывёл, які ўтрымліваецца, у асноўным, за спонсарскія грошы. Але ўжо тое, што горад знайшоў памяшканне, стварыў умовы, — вельмі добры прыклад.

У Наваполацку і Полацку ўлады таксама ідуць насустрач абаронцам жывёл. Грамадскаму аб'яднанню «Шанц» далі памяшканне ў арэнду, а грамадскаму аб'яднанню «Сябар» далі памяшканні пад стварэнне працоўных месцаў. На жаль, больш дзяржава такім арганізацыям дапамагчы нічым не можа. А яны робяць вельмі шмат: кормяць, прышчэпліваюць, стэрылізуюць, лечаць, шукаюць новых гаспадароў. Быў бы адпаведны закон, лягчэй было б павысіць узровень такой работы ў нашай краіне, падтрымаць яе.

■ Май на ўвазе

ПАКУЛЬ РОТА ТРЭНІРУЕЦЦА...

У сувязі з правядзеннем трэніровак зводнай роты ганаровай варты ў сталіцы будзе часова абмежаваны рух транспартных сродкаў.

Паводле інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», датычыцца гэта будзе ўчастка па праспекце Машэрава ад вуліцы Даўмана да праспекта Пераможцаў. 9, 11, 13, 16, 18, 21, 23 чэрвеня ў перыяд з 22.00 да 24.00, 26 і 28 чэрвеня з 22.00 да заканчэння трэніроўкі, а таксама з 23.00 20 чэрвеня да 5.30 21 чэрвеня рух аўтобусаў маршрутаў №№ 29, 44, 136 арганізуецца па праспекце Машэрава, вуліцы Багдановіча, праспекце Пераможцаў у абодвух напрамках з выкананнем прыпынкаў «Ст.м. «Няміга», «Палац спорту» на ўчастку, які змяняецца.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Узровень

АДЗІНЫ КЛАСІЧНЫ... НА ДВА ГАРАДЫ

Карэспандэнт «Звязды» пабываў у «самым еўрапейскім» беларускім універсітэце, дзе святкуюць, як у Канах, ставяць помнікі студэнтам, выдаюць дыпломы па спецыяльнасці «Турызм і гасціннасць»

Вяртанне «механічнай галавы»

Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт незвычайны па многіх прычынах. Па-першае, ва ўсім свеце існуюць адзінкі ўніверсітэтаў, факультэты якіх знаходзяцца ў двух гарадах (у нашым выпадку — у Наваполацку і Полацку. — **Аўт**.). Па-другое, універсітэт на 100% класічны, еўрапейскага тыпу, бо там рыхтуюць спецыялістаў як па тэхнічных, так і па гуманітарных спецыяльнасцях. Па-трэцяе, у Полацку на фасадзе будынка былога калегіума можна ўбачыць трэці ў Еўропе гадзіннік з фігуркамі, якія рухаюцца пад бой курантаў. Такія ж гадзіннікі ёсць толькі ў Празе і Кракаве.

І — сенсацыя: тут плануюць зрабіць аналаг механічнай галавы, якую змайстраваў Габрыэль Грубер, таленавіты навукоўца і вынаходнік, знакаміты выкладчык, які да 1800 года выкладаў архітэктуру і фізіку ў Полацкай езуіцкай калегіі. «Жалезная галава» здзіўляла сучаснікаў тым, што адказвала на пытанні і паўтарала міміку чалавека.

Амаль як у Канах.

Аднавіць «культурны код»

Быў час, калі ў Полацку і будучыя мастакі атрымлівалі пачатковую адукацыю — у сценах калегіума. У апошнім, адным з цяперашніх вучэбных карпусоў універсітэта, знаходзіліся копіі твораў такіх вядомых на ўвесь свет Майстроў, як Рафаэль, Мікеланджэла, Тыцыян і іншых. З нядаўняга часу рэпрадукцыі карцін вядомых мастакоў можна ўбачыць у дварах былога калегіума.

Віктар ЛУК'ЯНЕНКА, дацэнт кафедры архітэктуры ПДУ, член Саюза мастакоў Беларусі, прапанаваў канцэпцыю вулічнай экспазіцыі жывапісных работ. Сутнасць яе заключаецца ў тым, каб аднавіць некалі згублены «культурны код» Полацкай зямлі XVIII — першай паловы XIX ст. Для экспазіцыі прапанавалі работы мастакоў, творчасць якіх была звязана з Полацкім калегіумам.

Падзеяй не толькі ўніверсітэцкага маштабу стала адкрыццё залы гістарычнага касцюма. Там у храналагічнай паслядоўнасці можна ўбачыць, як выглядала форма «шкаляроў» розных стагоддзяў. Але не толькі гэта: у экспазіцыі адноўлены ланцужок падзей, пачынаючы з першага каменя ў падмурку калегіума і заканчваючы сучасным сцягам ПДУ.

Нагадаю, што сярод іншых цікавых «аб'ектаў», — калодзеж часоў сярэднявечча. Ён адноўлены на тым месцы, дзе і знаходзіўся.

У Наваполацку ў вестыбюлі аднаго з вучэбных карпусоў раз у тыдзень падчас вялікага перапынку арганізуюцца ланч-канцэрты! Студэнты могуць атрымаць асалоду ад «жывой» музыкі: паслухаць скрыпку, вакал і джаз... Слухачы сядзяць на мяккіх канапах, жуюць піражкі, запіваючы кавай ці гарбатай — такі ланч. Як растлумачылі ў рэктараце, вопыт перанялі ў шведаў. Артысты — з мясцовага музычнага каледжа. Некаторыя з іх — удзельнікі і лаўрэаты міжнародных конкурсаў.

Помнік сучаснай студэнтцы.

Веласіпедная паркоўка.

...І музычны факультэт

— Усё, што вы ўбачылі, і не толькі гэта — не для таго, каб здзіўляць гасцей. Мы многае ўжо зрабілі і робім, каб адраджаць і працягваць традыцыі калісьці адной з самых знакамітых альма-матар Еўропы. Ганарымся слаўнай гісторыяй нашай ВНУ. У XIX ст. у бібліятэцы было больш за 50 тысяч тамоў, існавала друкарня, унікальная астранамічная зала, выдаваўся першы ў Беларусі навуковы часопіс... Мы проста абавязаны пастарацца, каб універсітэт быў такога ж узроўню, як калісьці. І не горшым, чым самыя вядомыя сучасныя ўніверсітэты. Дарэчы, было вельмі прыемна пачуць ад міністра адукацыі, што наш універсітэт — сапраўды еўрапейскі, — расказвае карэспандэнту «Звязды» **рэктар ПДУ Дзмітрый ЛАЗОЎСКІ.**

Адна з галоўных мэт кіраўніцтва ВНУ — арганізаваць вучэбна-выхаваўчы працэс на ўзроўні лепшых замежных. Тут выкарыстоўваюць заходні вопыт у арганізацыі вучэбнага працэсу і па-за ім, запрашаюць вядомых навукоўцаў на выкладанне. Рыхтуюць студэнтаў па тэхнічных і гуманітарных дысцыплінах. Мара рэктара — адкрыць музычны факультэт. Распрацоўкі выкладчыкаў карыстаюцца вялікім попытам за мяжой. Ужо прададзена шмат патэнтаў на вялікія сумы.

Даведка «Звязды»: *Полацкі езуіцкі калегіум быў адкрыты ў 1581 годзе па ўказе польскага караля Стэфана Баторыя. Першы рэктар — вядомы прапаведнік Пётр Скарга. А ў 1812 годзе калегіум стаў Полацкай езуіцкай акадэміяй — першай вышэйшай навучальнай установай на тэрыторыі Беларусі.*

Дацэнт спявае са студэнтам...

Аўтару гэтых радкоў пашчасціла на свае вочы ўбачыць цырымонію ўручэння спецыяльнага прыза «Крыніца ведаў», якая вельмі нагадвала знакамітую цырымонію ў Канах, на кінафестывалі. Прэтэндэнты таксама прайшліся па чырвонай дарожцы і адказвалі на пытанні вядучых мерапрыемства. На сцэне адкрывалі канверты, у якіх былі схаваны імёны і прозвішчы лаўрэатаў.

Калі паміж гэтымі вельмі хвалюючымі момантамі выступалі артысты ўніверсітэцкай самадзейнасці, мне нават падалося, што трапіў у музычную акадэмію — настолькі прафесійна хлопцы і дзяўчаты спявалі і танцавалі. А калі дацэнт Аркадзь Оськін, кандыдат тэхнічных навук, і Лявон Кехваян, студэнт 5 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій, разам выканалі замежны шлягер, наогул быў ураджаны!

Між іншым, добрай традыцыяй сталі сумесныя паходы на прыроду выкладчыкаў і студэнтаў. Разам збіраюць дровы, вараць кашу... Але ніякага піва — на яго накладзена табу, як і на іншыя спіртныя напоі.

...Засталося дадаць, што сёлета ў Дзень універсітэта тут упершыню правялі акадэмічны баль — у дварах калегіума.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара і з архіва ўніверсітэта

ORTHODOX CATHOLIC FORUM MINSK 2014

ХРЫСЦІЯНСКАЯ ВЕРА ГАРАНТУЕ ПОШУКІ СВАБОДЫ

Пра гэта ў выніковай рэзалюцыі паведамілі ўдзельнікі Еўрапейскага праваслаўна-каталіцкага форуму

Прадстаўнікі хрысціянскіх канфесій шукалі адказы на пытанні маралі, з якімі сутыкаюцца суполкі ў сувязі з культурнымі і маральнымі зменамі ў Еўропе. Пасля выступленняў свяшчэннаслужыцеляў, абмеркавання і ўсебаковага разгляду праблем удзельнікі форуму прынялі рэзалюцыю.

У выніковым дакументе прадстаўнікі каталіцкай і праваслаўнай цэркваў выказалі занепакоенасць паскораным працэсам адчужэння паміж Еўропай і яе хрысціянскімі каранямі. На месцы адкінутай хрысціянскай веры і маралі ў людзей узнікае пачуццё пустаты, якое прыводзіць іх да адчаю і нігілізму. Царква прапаноўвае вечныя каштоўнасці, аб'ядноўваючы ўсё чалавецтва.

На працягу стагоддзяў як на Усходзе, так і на Захадзе незвычайнае багацце культурных дасягненняў на кантыненце было здабыта ўкладам хрысціянскай веры. «Мы падкрэсліваем, што хрысціянская вера гарантуе, а не абмяжоўвае пошукі свабоды і шчасця... Вера ў Хрыста не адмяняе разнастайнасці чалавецтва. Яна абагачае і спрыяе развіццю элементаў ісціны і дабра, якія ёсць у чалавечых культурах», — гаворыцца ў рэзалюцыі.

Разрыў, які сёння існуе паміж хрысціянствам і пераважным кірункам думкі, мае сур'ёзныя наступствы для будучых Еўрапейскіх інстытутаў і жыцця Еўропы. Сёння ў многіх еўрапейцаў больш няма стабільных арыенціраў для фарміравання ўласных маральных паводзін і разумення, што добра і што дрэнна, таму што жывуць яны, падпарадкоўваючыся волі «свайго аўтаномнага я».

«Як пастары, мы хочам несці лепшае з нашага маральнага навучання нашым прыхаджанам, а як грамадзяне — данесці гэта да нашых урадаў і інстытутаў Еўрапейскага саюза... Хрысціянскія абшчыны могуць сведчыць аб тым, што з'яўляецца карысным для ўсіх...» — падкрэслена ў рэзалюцыі.

Форум быў арганізаваны пры падтрымцы Беларускага Экзархата, яго сустаршынямі сталі кардынал Петэр Эрдзё, старшыня Рады біскупскіх канферэнцый Еўропы, арцыбіскуп Эстэргомскі і Будапешцкі, і Мітрапаліт Сасімскі Генадзіус, які прадстаўляе Канстанцінопальскі Патрыярхат.

Чарговая пляцоўка для правядзення мерапрыемстваў была выбрана па выніках перагавораў свяшчэннаслужыцеляў падчас форуму.

— Наступны форум пройдзе ў Парыжы ў 2016 годзе. Даты пакуль не зацверджаны, але плануецца, што гэта адбудзецца ў кастрычніку ці лістападзе, — сказаў Мітрапаліт Сасімскі Генадзіус.

Удзельнікі форуму таксама выказалі падзяку Беларускаму Экзархату Рускай праваслаўнай царквы і каталіцкай Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі, ураду Беларусі і мясцовым органам улады за гасціннасць і выдатны ўзровень арганізацыі форуму.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

АДХОДЫ ПАТРАБУЮЦЬ РЭФОРМАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Практыка паказвае: чым больш у горадзе пунктаў збору для адходаў, тым людзі ахвотней здаюць старую тэхніку. Лямпачкі і батарэйкі ідуць літаральна на «ўра», а ў цэлым статыстыка па Нідэрландах сведчыць: на аднаго чалавека выходзіць па 8 кілаграмаў адходаў ЭЭА ў год, што раўняецца сярэднему паказчыку па спажыванні на чалавека.

ТАКСІ ДЛЯ ХАЛАДЗІЛЬНІКА

У Беларусі распрацаваны праект нацыянальнай канцэпцыі сістэмы збору адходаў бытавой тэхнікі ад насельніцтва. Адным з яе аўтараў з'яўляецца **дырэктар прадпрыемства па перапрацоўцы і ўтылізацыі адходаў ААТ «БелВТІ» Аляксандр КІРПІЧНІК.** Ён прапанаваў цэласную сістэму збору: у гандлёвых сетках, спецыялізаваных крамах, рамонтных майстэрнях, унутрыдваровых пляцоўках і нарыхтоўчых пунктах. Аднак ажыццявіць удалося толькі некалі задум: сёння прадпрыемства прапануе бясплатную паслугу «БелВТІ-таксі» па вывазе старой бытавой тэхнікі. Па Мінску курсіруюць ужо тры таксі. Неўзабаве плануецца запусціць адпаведную паслугу ў рэгіёнах. Другі варыянт — здаваць адходы ЭЭА самастойна ў пункце прыёму на Славінскага, 1, і атрымліваць матэрыяльную ўзнагароду (750 рублёў за кілаграм). Гэтыя новаўвядзенні далі плён: па словах Аляксандра Кірпічніка, летась было перапрацавана 1054 т адходаў і атрымана 28,915 кг каштоўнага металу ў залатым эквіваленце. Разам з тым, ініцыятыва больш-менш спраўна працуе толькі ў беларускай сталіцы. А як быць з рэгіёнамі, дзе нават не маюць клопату пра адходы ЭЭА?

НА ЛАКАЛЬНЫМ УЗРОЎНІ

Праблема абыходжання з адходамі ЭЭА патрабуе комплекснага падыходу: адна арганізацыя нічога не вырашыць, патрэбна наладзіць кантакты і з органамі мясцовай улады, і з перапрацоўшчыкамі другаснай сыравіны, і нават перагледзець заканадаўства. Чаму б Беларусі не пераняць вопыт нідэрландскіх калег? Менавіта таму арганізатарамі былі выбраны тры беларускія рэгіёны з вялікай колькасцю адходаў і адсутнасцю сістэмы іх збору. Найперш перад выканаўцамі праекта стаіць задача распрацаваць стратэгію ўстойлівага абыходжання з адходамі ЭЭА. Якім чынам будзе праводзіцца збор адходаў — невядома, бо гэта і ёсць аб'ект вывучэння: цяпер нават складана разлічыць, якога тыпу кантэйнеры змогуць саслужыць добрую службу ў гэтай справе. Як адзначыла **асістэнт праектаў па адходах установы «Цэнтр экалагічных рашэнняў» Кацярына ЕЎСЮКОВА,** у выбраных рэгіёнах будзе праведзена масавая інфармацыйная кампанія для насельніцтва. Па выніках вывучэння праблемы, папулярызуючых акцый арганізатары спадзяюцца ўвесці эфектыўную стратэгію абыходжання з адходамі ЭЭА.

Замовіць бясплатны вываз старой бытавой тэхнікі ў Мінску можна па тэлефонах 8(017) 263 13 63, 263 13 23

Кацярына РАДЗЮК.

ААТ «Нясвіжскія Астроўкі»:

ПРАЦУЕ ЗЛАДЖАНА, АРГАНІЗАВАНА, БЕЗ ПРАБЛЕМ

ААТ «Нясвіжскія Астроўкі» — паспяховае рэнтабельнае прадпрыемства, якое працуе з прыбыткам, своечасова плаціць людзям зарплату і развівае сацыяльную сферу. І ніякага сакрэту ў такіх поспехах няма. Яны заснаваны перш за ўсё на ўмелай арганізацыі працоўнага працэсу і прыцягненні кваліфікаваных спецыялістаў.

1.

2.

ААТ «Нясвіжскія Астроўкі» — сучаснае сельскагаспадарчае прадпрыемства, якое спецыялізуецца на вытворчасці малака і мяса буйной рагатай жывёлы, вырошчванні цукровых буракоў, збожжавых і зернебабовых культур.

3.

4.

5.

ЧАЛАВЕК ПАВІНЕН ЖЫЦЬ ПОЎНЫМ ЖЫЦЦЁМ, А НЕ ТОЛЬКІ ПРАЦАВАЦЬ

У гэтай гаспадарцы, як правіла, застаюцца маладыя спецыялісты. Так, пяці чалавекам, якія засталіся пасля абавязковай двухгадовай адпрацоўкі, дзяржава цяпер даплачвае да зарплаты 760 тысяч рублёў у месяц. Але і гаспадарка не адстае.

— Цяпер у людзей іншая матывацыя. Усе хочуць жыць добра, і гэта нармальна, — лічыць **Людміла ГУТНІК, якая кіруе прадпрыемствам ужо 12-ы год.** — Чалавек павінен жыць поўным жыццём, а не толькі працаваць.

Яна ўпэўнена, што культура вытворчасці і культура побыту — два неад'емныя паняцці. Калі чалавеку добра ў побыце, адпачынку, то ён будзе добра і працаваць. Таму клопат пра людзей — на першым плане.

Сярэднямесячная зарплата па прадпрыемстве за першы квартал гэтага года склала 5 762 тыс. рублёў. Практычна ўсе работнікі жывуць ў добраўпарадкаваным жыллі з усімі выгодамі, якое па заканчэнні вызначанага тэрміну працы ў гаспадарцы можна прыватызаваць.

Удой малака ад адной каровы за 4 месяцы гэтага года ў гаспадарцы склаў 2426 кг, тлустасць рэалізаванага малака — 3,96%, таварнасць — 90,9%. Класам «экстра» і вышэйшым гатункам рэалізавана 99,4% атрыманага малака. Прыбытак ад яго рэалізацыі — 4 млрд 634 млн рублёў. Рэнтабельнасць па малацэ склала 70%.

Па выніках года ў цэлым на прадпрыемстве выяўляюцца лепшыя работнікі, якія ўзнагароджваюцца прэміямі і каштоўнымі падарункамі. Акрамя таго, ідзе штомесячнае прэміраванне за выкананне плана. Пастаянна прэміруюцца спецыялісты і галоўныя спецыялісты гаспадаркі. Таму людзі зацікаўлены добра працаваць і адказна ставяцца да выканання сваіх абавязкаў.

У ГАСПАДАРЦЫ ЎСЁ РОБІЦЦА СВОЕЧАСОВА

Вясна сёлета выдалася ранняя, пасяўная была праведзена ў аптымальныя тэрміны. За 9 рабочых дзён пасеялі яравыя збожжавыя, а за 12 дзён — цукровыя буракі. «Хлопцы проста рваліся ў бой, — кажа Людміла Гутнік. — Працавалі на пасяўной па 14 гадзін у суткі! І прычым добрасумленна». Для атрымання прагнозных паказчыкаў па вытворчасці ўсіх культур быў унесены поўны комплекс мінеральных угнаенняў. Своечасова прайшла хімпраполка пасеваў кукурузы, цукровых буракоў, ячменю. Гаспадарка цалкам гатова да нарыхтоўкі кармоў.

МАЛАКО — КЛАСА «ЭКСТРА»

За мінулы год ААТ «Нясвіжскія Астроўкі» здало 83,7% малака класам «экстра» і вышэйшым гатункам 16,1%.

— Удой малака ад адной каровы за 4 месяцы гэтага года склаў 2426 кг, тлустасць рэалізаванага малака 3,96%, таварнасць — 90,9%, — адзначае Людміла Гутнік. — Класам «экстра» і вышэйшым гатункам рэалізавана 99,4% атрыманага малака. Прыбытак ад яго рэалізацыі склаў 4 млрд 634 млн рублёў. Рэнтабельнасць па малацэ склала 70%.

Па выніках чатырох месяцаў сярод фермаў па ўдоі малака на адну карову першае месца заняла рабатызаваная ферма ў вёсцы Макашы з удоем 3401 кг. Лідзіруе гэтая ферма і па сярэднядзённым удоі малака ад адной каровы — 28,6 кг, у той час як па ААТ гэтая лічба складае 23,1 кг. Рабатызаваная ферма ў Макашах з пагалоўем у 338 галоў кароў (у той час як у гаспадарцы 1047 галоў) дае валавы надой малака 45,5% ад агульнага. Вось што значыць не баяцца новага! І, дарэчы, гэтая ферма за тры гады ўжо акупіла сябе на 64%.

— Арганізацыя працы, добрая тэхніка, своечасова адрамантаваная і добра падрыхтаваная... — пералічвае складнікі эфектыўнага прадпрыемства кіраўнік гаспадаркі Людміла Гутнік. — Абаротных сродкаў хапіла, каб закупіць угнаенні, паліва. Усё праходзіць зладжана, арганізавана, без праблем...

Вынік — павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці, выкарыстанне перадавых тэхналогій, высокая якасць прадукцыі.

1. Новая вуліца Дружная — першае, што бачыш на шляху ў аграгарадок.
2. Разлікам ураджайнасці пашы занятыя загадчыца малочнатаварнай фермы «Малінаўка» Надзея СУКАЛА і галоўны заатэхнік Галіна РЫБАЛТОЎСКАЯ.
3. На чэрвеньскай пашы.
4. Механізатары Валерый КІШКО і Віталь МАНУЛІК правяраюць стан тэхнікі для нарыхтоўкі кармоў.
5. Аляксандр СУКАЛА — адзін з лепшых механізатараў гаспадаркі.

Валавая прадукцыя ААТ «Нясвіжскія Астроўкі» за 1 квартал гэтага года ў супастаўных цэнах да 2013 года склала 100,3%. Атрымана выручкі 14 млрд 226 млн рублёў, ці 128%. У тым ліку ад прадукцыі жывёлагадоўлі — 10 млрд 076 млн рублёў, раслінаводства — 4 млрд 190 млн рублёў. Прыбытак склаў 4 млрд 783 млн рублёў, або на 1 млрд 162 млн рублёў больш, чым за адпаведны леташні перыяд. Рэнтабельнасць продажу склала 27,2%, рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі — 49,5%, агульная рэнтабельнасць — 61,1%.

Святлана БУСЬКО, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА. *УНП 600032196*

Наш культурны асяродак

Жырандоля

Выпуск № 15 (232)

■ Глядзіце, хто прыйшоў!

«ТЭАТР ПАЧЫНАЕЦЦА ТАМ, ДЗЕ ЗАКАНЧВАЮЦЦА СЛОВЫ...»

Пра асацыятыўнае мысленне і творчыя эксперыменты — размова з галоўным рэжысёрам Магілёўскага абласнога драмтэатра Сауліусам Варнасам.



Сёлета ў культурным жыцці Магілёва адбылася значная падзея. У абласнога драматычнага тэатра, які паўтара года працаваў без галоўнага рэжысёра, з'явіўся таленавіты мастацкі кіраўнік Сауліус Варнас. Прайшло зусім мала часу, але нават не толькі тэатралы заўважылі першыя станоўчыя вынікі гэтага супрацоўніцтва. Пастаноўка гэтага майстра сцэны «Фрэкен Жулі» на сёлетнім міжнародным маладзёжным фестывалі «M@rt.Контакт-2014» была адзначана спецыяльнымі ўзнагародамі двойчы — за лепшую рэжысёрскую працу і таленавітае выкананне галоўнай ролі магілёўскай актрысай Аленай Крыванос. А нядаўна тэатр ажыццявіў вельмі цікавы праект «M@rt.Контакт-2016» — абвясціў набор школьнікаў на так званыя акцёрскія курсы. Калі гэта супрацоўніцтва будзе мець плён, падлеткі змогуць стаць навучэнцамі акцёрскай школы Сауліуса Варнаса. Аўтар ідэі спадзяецца, што Магілёўскі драмтэатр можа стаць з'явай у культурным асяроддзі краіны.

— Якраз 55 гадоў таму ў Магілёве адбыўся першы і апошні выпуск тэатральнай студыі. На жаль з-за недахопу сродкаў яна закрылася. Але дзякуючы ёй адбыўся прыток таленавітай моладзі ў тэатр... Вы вырашылі паўтарыць гэты прыклад?

— Як любому арганізму, тэатру патрэбна «жывая кроў». Тыя акцёры, якія сёння заняты ў адных спектаклях, заўтра будуць іграць у іншых, больш адпаведных іх узросту і патрабаванням. На іх месца павінны прыйсці іншыя. Студыя пры тэатры вельмі патрэбна, але спачатку гэта будзе проста праект — ніякіх вялікіх амбіцый. Мы паспрабуем на працягу 2 гадоў паставіць маладзёжны спектакль. Падчас гэтай работы ўзнікне шмат пытанняў і па сцэнічнай мове, і па імправізацыі, і па голасе — усё гэта мы будзем развіваць. Тым больш, што ў тэатры ёсць і акцёры, і рэжысёры, якія маюць вопыт педагагічнай працы. Мы разам павінны ўвесці падлеткаў у гэты арганізм, у нашу прафесію.

Тэатр не з'яўляецца слугой літаратуры. Мы, выбраўшы адну ці некалькі тэм з твора, ператвараем тэкст у сваю мову, спрабуем знайсці, праз што яго выразіць.

— Вы пачыналі менавіта так?

— Перад тым, як паступіць у Ленінградскі інстытут тэатра, музыкі і кіно, я вучыўся ў акцёрскай студыі Юозаса Мільцініса ў Панявежысе. Гэта быў адзін з вядучых тэатраў у Савецкім Саюзе, куды прыязджалі тэатралы нават з Уладзівастока. Мільцініс быў вучнем знакамітага французскага рэжысёра Шарля Дзюлена, працаваў з такімі вядомымі акцёрамі, як Марсэль Марсо, Жан Вілар, Мадлен Рэно. Падчас вучобы ў яго студыі мы мелі магчымасць паспрабаваць сябе не толькі ў якасці артыстаў, але і тэхнічных работнікаў. Вельмі карысна пазнаць тэатр з усіх бакоў, каб не дзяліць працу на асноўную і дапаможную. Толькі агульнымі намаганнямі можна стварыць нешта па-сапраўднаму значнае.

— Чаму вы збіраецеся навучыць магілёўскую моладзь?

— У першую чаргу пачнём з трэнінгу па асацыятыўным мысленні, які прапаноўвалі Рудольф Штайнер і яго паслядоўнік Міхаіл Чэхаў. Школа Штайнера была адной з вядучых ва ўсей Еўропе. Ён падрыхтоўваў ужо дарослага чалавека зноўку падыходзіць да светаразумення.

— Ёсць ужо ахвотныя паспрабаваць сябе? Як будзе весціся адбор?

— Зразумела, ёсць. І мы спадзяёмся прыняць усіх. Іх веды мяне не цікавяць — гэта будзе размова. Ёсць пэўныя тэсты, якія раскрываюць прыроду чалавека, тое, што закладзена ў ім, падказваюць, на што трэба звярнуць увагу. Мне патрэбна ведаць пра іх светаадчуванне, пра тое, што для іх важна, што падабаецца ў жыцці, што хацелася б выправіць, змяніць. Даведацца пра іх імкненні, фантазіі, мары. Артыст — вельмі складаная прафесія. Напачатку нераскрыты, праз 3 гады ён можа стаць самым лепшым. Трэба стварыць умовы, каб гэта адбылося, каб маладыя людзі жадалі, ствараць, размаўляць са светам. Яны павінны самі будаваць храм у сваёй душы і заклікаць да гэтага ўсіх тых, хто будзе прыходзіць у тэатр. Мы павінны заставацца вучнямі да канца жыцця, нават тады, калі ў кішэні ляжыць некалькі дыпломаў. Як казаў Дастаеўскі, пакуль мы шукаем ісціну, мы жывыя. Варта толькі спыніцца ў пошуках яе — і смерць прыходзіць адразу.

— Падрыхтоўка добрых акцёраў патрабуе вялікіх сродкаў. Ці гатовы тэатр ісці на такія ахвяры?

— Спачатку мы будзем ахвяраваць сваім часам дзеля ідэі, а калі ўбачым, што гэта патрабуе дадатковых укладанняў, будзем вырашаць, як дзейнічаць далей. Калі спатрэбіцца, мы зможам запрасіць настаўніка па энергетыцы з Пецярбурга, педагогаў з Літвы, Украіны, Мінска. Зараз трэба або рыхтаваць спецыялістаў высокай якасці, або наогул не займацца гэтым. Але пакуль курсы не будуць платнымі. Я наогул скептычна стаўлюся да сцвярджэння: чым больш плацяць, тым лепш працуюць. Чалавеку хапае мінімуму, каб ён мог годна жыць. У творчасці людзі часцей за ўсё працуюць за ідэю. Калі хочаш вялікіх грошай, трэба ісці ў бізнес. Але я ведаю людзей, якія сталі багатымі, а шчасця так і не знайшлі. Галоўнае, каб можна было рэалізаваць сябе.

— А якія адчуванні былі ў вас, калі вы толькі прыйшлі ў тэатр? Як вы зразумелі, што гэта менавіта ваша прафесія?

— Юозас Мільцініс быў для мяне ў той час недасяжнай велічынёй. У яго вучыліся такія зоркі, як Данатас Банёніс, Бронюс Бабкаўскас, Стасіс Петронайціс, іншыя выдатныя артысты. Пасля школы я наогул паступіў у політэхнічны інстытут на факультэт прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва. Але аднойчы сустрэў таварыша, які пахваліўся, што вучыцца ў Мільцініса, і я таксама захацеў паспрабаваць. Памятаю, калі прыйшоў, набор ужо скончыўся, але мяне згадзіліся паглядзець. Я чытаў вершы, паказваў нейкія эцюды і — мяне прынялі! Мільцініс быў не з тых, хто робіць кампліменты, добрых слоў ён наогул не казаў. Да ўсіх без выключэння ставіўся так, што складвалася ўражанне: ты пустое месца, ні на што не варты чалавек. І трэба было пераступіць цераз амбіцыі, каб застацца ў яго студыі і дасягнуць нейкага поспеху. Дарэчы, я паралельна вучыўся ў політэхнічным інстытуце і ў студыі Мільцініса — спаў усяго па 4 гадзіны ў суткі. Было цяжка, але я не аб чым не шкадую.

— У розныя гады вы працавалі рэжысёрам і кіраўніком Панявежскага тэатра драмы імя Мільцініса, галоўным рэжысёрам Шаўляйскага тэатра драмы, дырэктарам Рускага тэатра драмы ў Вільнюсе. Прымалі ўдзел у шматлікіх міжнародных тэатральных праектах, праводзілі майстар-класы для акцёраў і рэжысёраў у Лондане, Вільнюсе, Львове, Кішынёве... Як вы трапілі ў Магілёў?

— З дырэктарам тэатра Андрэем Новікавым я пазнаёміўся ў Літве, дзе ён быў на маім майстар-класе. Пасля гэтага я і атрымаў ад яго запрашэнне на пастаноўку спектакля. Магілёўскі «Тарэлкін» па драме Сухава-Кабыліна быў у мяне ўжо пяты па ліку. Але ён для мяне самы дарагі і лепшы. «Фрэкен Жулі» таксама не першы мой варыянт. Адзін з іх быў зроблены на сцэне сусветна вядомага нацыянальнага тэатра Македоніі — у Скоп'і. Але магілёўская пастаноўка мне больш падабаецца. У Алены Крыванос, якая іграе галоўную ролю, ёсць нешта такое, што надае пастаноўцы метафарычны сэнс. У тых, хто спавядае класічны літаратурны тэатр, могуць з'явіцца пытанні: чаму такое гучанне, такія акцэнты, чаму так трактуецца тэкст? Але той, хто ўспрымае татальны рэжысёрскі тэатр, гэта разумее. Мне вельмі падабаюцца нашы стасункі з дырэктарам тэатра. У іншых тэатрах з'яўляліся розныя недагаворанасці, канфлікты, таму што адміністрацыі патрэбна адно, а мастацкай частцы іншае. Зразумела, тэатр зарабляе сваімі спектаклямі, але ў Андрэя Новікава ёсць чуццё, разуменне таго, для чаго наогул тэатр існуе. А ён існуе менавіта для таго, каб заразіць гледача творчым пачаткам. Сэнс нашага знаходжання на зямлі не ў тым, каб проста забаўляцца. Мы не павінны патураць нізкім, безгустоўным жаданням. Трэба, каб тэатр выхоўваў. Калі ў нас атрымаецца стварыць тэатр, які загучыць як з'ява, гэта будзе добра. Але, каб навучыцца плысці, трэба спачатку скокнуць у ваду, паспрабаваць.

Сусветная тэндэнцыя ў тым, што тэкст зыходзіць са сцэны, яго ўсё менш і менш, а больш паветра. Тэатр пачынаецца там, дзе заканчваюцца словы.

— Гэта будзе эксперыментальны тэатр?

— Рэжысёрскі. Сёння ён і не можа быць іншым. Эксперыментальным можна назваць кожны тэатр, які знаходзіцца ў пошуках. Але мне цікава размаўляць на ўзроўні лёсу. Тэатр не з'яўляецца слугой літаратуры. Мы, выбраўшы адну ці некалькі тэм з твора, ператвараем тэкст у сваю мову, спрабуем знайсці, праз што яго выразіць. Мы вырашылі, што створым некалькі кірункаў у тэатры, адзін з якіх будзе дакументальны. На малой сцэне будуць ісці актуальныя спектаклі па драматургіі Алексіевіч — аб самагубстве, аб тым, чаму столькі няшчасных, аб афганскай праблеме. І над гэтым ужо працуе акцёр і рэжысёр нашага тэатра Уладзімір Пятровіч. Яшчэ адзін рэжысёр Віктар Куржалаў хутка прадставіць спектакль па п'есе «Свае людзі — паладзім».

— А як жа маштабныя па колькасці акцёраў і дэкарацый пастаноўкі, якія так любіць наш глядач? Тэатр ад іх адмовіцца?

— Мы падумаем, як гэта рабіць. Можна казаць пра ложак, а можна — пра душу ў ложку.

— Што сёння ў тэатральным свеце лічыцца наватарскім, выклікае інтарэс?

— Ёсць розныя кірункі пошукаў. Цікавасць выклікаюць тыя інсталяцыі, што робіць Дзмітрый Крымаў са студэнтамі ў Маскве, цырк Вячаслава Палуніна ў Санкт-Пецярбургу — гэта таксама кірунак тэатра з мінімумам тэксту. Наогул сусветная тэндэнцыя ў тым, што тэкст зыходзіць са сцэны, яго ўсё менш і менш, а больш паветра. Тэатр пачынаецца там, дзе заканчваюцца словы. Вучоныя адкрылі, што мы можам стасавацца не толькі праз словы, але і без іх. І тэатр дапамагае людзям развіць гэтыя здольнасці.

— Па адукацыі вы яшчэ і архітэктар-будаўнік. Якім бачыце Магілёў?

— Па энергетыцы ён добры, не мае агрэсіі. Людзі таксама добразычлівыя. Магілёў асацыюецца ў мяне, каталіка, з праваслаўным Паднікольскім манастыром. Калі ёсць жаданне ўбачыць Магілёў, ідзіце ў манастыр. Гэта пункт адліку. А добрых месцаў у горадзе шмат — плошча каля Ратушы, пешаходная вуліца Ленінская... Наогул, Беларусь мяняецца ў лепшы бок. Мне падабаецца Мінск — праз нейкі час ён будзе вельмі прыгожы. У ім ёсць вельмі «смачныя» куточкі. Краіна жыве будучыняй, адчуваецца станоўчая энергія. Я жыву тут са студзеня і пакуль не расчараваўся.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

ЖЫЦЦЁ, ВАРТАЕ КІНО

Пісьменніца Наталля Голубева расказвае пра новы фільм, прысвечаны першаму кіраўніку БССР Аляксандру Чарвякову



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

9-га ліпеня (у панядзелак) на тэлеканале АНТ, у межах праекта «Зваротны адлік», адбудзецца паказ фільма «Аляксандр Чарвякоў. Абвінавачваецца бальшавік...» У стужцы, знятай у Творчай майстэрні Уладзіміра Бокуна, апавядаецца пра асобу, знакавую для ўсёй Беларусі, якая, дарэчы, і ў гісторыі «Звязды» пакінула слой след. Рэжысёр карціны — Настасся Мірашнічэнка, аўтар сцэнарыя — Наталля Голубева.

Фільм працягвае серыю палітычных партрэтаў выдатных дзеячаў рэспублікі. Да іх ліку, несумненна, адносіцца Чарвякоў, бо з'яўляецца першым кіраўніком БССР. Гэта стужка пра складаны лёс чалавека, які стаяў ля вытокаў суверэннай дзяржавы і ствараў яе разам з аднадумцамі, людзьмі, апантанымі ідэяй нацыянальнага адраджэння — Змітром Жылуновічам (Цішкам Гартным), Мікалаем Галадзедам, наркамам земляробства Змітром Прышчэпавым, наркамам асветы Антонам Баліцкім. У аснову стужкі пакладзены гістарычныя дакументы, малавядомыя факты дзейнасці першага старшыні беларускага ЦВК — некаторыя з іх гледачу будуць паказаны ўпершыню.

Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася са сцэнарыстам Наталляй Голубевай, каб з першых вуснаў пачуць новыя звесткі з жыцця выдатнага кіраўніка Беларусі.

— Чарвякоў вельмі далікатна ставіўся да нацыянальнага пытання. Тыя прынцыпы талерантнасці, якой мы сёння так ганарымся, закладваліся менавіта пры ім і пры яго непасрэдным удзеле...

— Нацыянальнае пытанне ў Беларусі мела свае асаблівасці. У дарэвалюцыйны перыяд статус і становішча ў беларускім грамадстве залежалі ад таго, да якой нацыянальнасці ты адносішся. Сам Чарвякоў пісаў пра гэта ў сваім артыкуле «За савецкую Беларусь»: «Беларускае насельніцтва складала ў пачатку стагоддзя 70%, рускіх на нашых землях жыло 15%, палякаў — 2%, яўрэяў — 10%». Нягледзячы на гэта, пры царызме вядучыя ролі ў Беларусі займалі рускія і палякі, першыя — у якасці прадстаўнікоў адміністрацыі, другія — як найбольш буйныя землеўласнікі». Да таго ж Чарвякоў разумеў, што рашэнне нацыянальнага пытання зводзіцца не толькі да раўнапраўя моў. Трэба было падняць культурны, адукацыйны ўзровень народаў, якія жывуць у Беларусі, бо ён істотна адрозніваўся, забяспечыць ім роўныя правы на працу, адукацыю і такім чынам падняць эканоміку краіны, яе агульную культуру.

— Наколькі востра, сярод іншых, стаяла беларускае нацыянальнае пытанне?

— Так, Чарвякоў пайшоў на вельмі смелы крок. У лютым 1921-га ЦВК Беларусі звярнуўся да землякоў, якія жылі за мяжой, з прапановай вярнуцца на Радзіму. Многія пакінулі родныя мясціны перад Першай сусветнай, значны адток прыпаў на 1915–1920 гады. Кіраўнік рэспублікі не абяцаў ім нічога, акрамя магчымасці ўключыцца ў працэсы нацыянальнага адраджэння, адкрыта сказаў пра цяжкасці. З просьбай аб садзейнічанні ён звярнуўся асабіста да Анатоля Луначарскага, у Савет Народных камісараў РСФСР. І яго падтрымалі. У адпаведнасці са спецыяльна прынятым дэкрэтам, «культурнікі-беларусы» адкамандзіроўваліся на Радзіму. Для правядзення культурнай працы і выкладання ў Беларускім дзяржаўным універсітэце толькі ў канцы 1921-га ў рэспубліку вярнулася больш за 300 чалавек. У той жа час урад прыняў рашэнне аб выдаткаванні на беларусізацыю 5 мільёнаў рублёў — не маленькай на той час сумы. Больш за тое, Наркамату асветы дадаткова выдзелілі яшчэ 2 мільёны рублёў на заахвочванне тых навукоўцаў, літаратараў, якія ў сваёй працы выкарыстоўвалі беларускую мову.

— Відавочна, вынікі ажыццяўлення такой праграмы не прымусілі сябе чакаць?

— У 1922-м была створана першая беларуская навуковая арганізацыя — Інстытут беларускай культуры. У рэспубліцы з'явіўся свой беларускі тэатр, на экраны выйшаў першы беларускі фільм — «Лясная быль» Юрыя Тарыча. Аднак Чарвякоў пад беларусізацыяй разумеў не толькі мову, але і фарміраванне ўмоў для выхавання сваіх нацыянальных кадраў для працы ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі, быў супраць гвалтоўнага насаджэння беларускай мовы, выступаў за тое, каб людзі самі зразумелі неабходнасць яе ўжытку. Таму працэс беларусізацыі праходзіў паэтапна.

— Аднак гэтае адраджэнне беларускасці ўсё ж было прыпынена...

— Смелым у дзейнасці Чарвякова было і тое, што ён абапіраўся на старыя кадры інтэлігенцыі, — і гэта пры тым, што пачалося іх адкрытае цкаванне. У жніўні-верасні 1922 года з Расіі ў адміністратыўным парадку выслалі 200 лепшых прадстаўнікоў інтэлігенцыі. ГПУ — Галоўнае палітычнае ўпраўленне — у сваёй пастанове, прынятай без судовага разгляду, высылку інтэлігенцыі з асяроддзя прафесараў, урачоў, аграномаў, літаратараў за мяжу называе «... першым папярэджаннем Савецкай улады да гэтых слаёў». Не стала выключэннем і беларуская інтэлігенцыя. За ёй пільна сачылі, глядзелі, каб усё адпавядала генеральнай лініі партыі. Яшчэ нядаўна запрошанага ў Беларусь Мітрафана Доўнар-Запольскага выслалі з рэспублікі ў 1926 годзе, бо яго падручнік «Гісторыя Беларусі» не адпавядаў поглядам партыі на гістарычнае мінулае беларускіх земляў. Падтрымка творчай інтэлігенцыі пасля і для самога Чарвякова абернецца трагедыяй: у 1930 годзе будзе сфабрыкавана справа «Саюза вызвалення Беларусі», па якой арыштуюць 108 чалавек, а старшыню ЦВК абвінавацяць у сувязях з яго членамі, у падтрымцы беларускага шавінізму.

— Чаму напрыканцы жыцця Аляксандр Чарвякоў напісаў «пакаянны артыкул», у якім адмаўляўся ад усіх сваіх поглядаў?

— Нягледзячы на эканамічныя поспехі Беларусі (на той час па тэмпах развіцця яна апярэджвала нават РСФСР), дзейнасць беларускага кіраўніцтва прызналі шкоднай, а Чарвякова абвінавацілі ў скочванні да апартунізму і нацыянал-дэмакратызму. За тымі высновамі далей маглі адбыцца рэпрэсіі, якія ўсё ўзмацняліся, аднак Чарвякова ў рэспубліцы ўсё ж пакінулі. Доўгіх сем гадоў да трагічнай развязкі, самазабойства, Чарвякова знішчалі павольна, езуіцкім спосабам праз рэзкую крытыку, неабгрунтаваныя абвінавачванні. Гэта была драма адданага партыі рэвалюцыянера, які бачыў і разумеў, што адбываецца, аднак быў бяссільны нешта змяніць.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Газета «Звязда» як люстэрка жыцця Чарвякова

На працягу жыцця Аляксандра Чарвякова газета «Звязда» з'яўлялася тым органам, у якім, як у люстэрку, адлюстроўваліся этапы яго дзейнасці, — ад поспеху да рэзкай крытыкі, якая таксама разгортвалася на старонках нашай газеты. Менавіта ў «Звяздзе» ў 1927 годзе быў надрукаваны праграмны артыкул Чарвякова «За Савецкую Беларусь», дзе былі апісаны поспехі беларусізацыі і нацыянальна-культурнага адраджэння, вызначаны шляхі далейшага развіцця з улікам нацыянальных асаблівасцяў. Палажэнні, агучаныя ў ім, выклікалі ўсеагульнае ўхваленне. У публікацыях таго часу шмат водгукаў, лістоў працоўных, якія выказваюць падтрымку «ўсебеларускаму старасце». А ў 1929 годзе гэтыя ж працоўныя з яшчэ большай актыўнасцю на старонках газеты выкрываюць Чарвякова за адступленне ад генеральнай лініі партыі. Свае погляды ў 1929-м рэзка памяняў і сам Чарвякоў. Менавіта ў «Звяздзе» быў надрукаваны яго артыкул, у якім Чарвякоў прызнаваў свае погляды ў нацыянальным пытанні памылковымі.

■ Прэм'ера

ТРЫ КАРТЫ

Ён паклікаў яе ў... ігральны дом. Пры тым, што Ліза гатовая была пайсці за Германам на край свету. Аддала перавагу яму перад харошым, заможным і надзейным жаніхом. Але яго паліла іншая страсць. Як магла скончыцца гэтая гісторыя?

У Пушкіна, які напісаў «Пікавую даму», фінал адзін. У Пятра Чайкоўскага, які ствараў оперу паводле лібрэта свайго брата Мадэста, усё зусім не так. І не магло, напэўна, быць інакш: чалавек, які цалкам аддаецца страсцям, трапляе ва ўладу дэманічных сіл, ён не супраціўляецца ім, а наадварот, песціць сваё жаданне выйграць грошы. У выніку — прайграе душу, жыццё. І не толькі сваё.

Ці мала такіх гісторый сёння? Ды безліч — дэман азарту (зрэшты, і любы іншы) вельмі моцны. Трапіш да яго ў палон — і ўсё, існуеш згодна з яго ўмовамі, у галаве толькі тры карты: тройка, сямёрка, туз. Тры карты, якія могуць перавярнуць жыццё. Такі — так!

У новай версіі «Пікавай дамы» Пятра Чайкоўскага ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь якраз робіцца акцэнт на містыцы, якая суправаджае страсныя натуры, такія, як Герман. Ды і ў Лізы, па сутнасці, свая страсць — да Германа, яна таксама губіць дзяўчыну. Што ўжо казаць пра старую графіню: тая хоць і аддае Богу душу, але наўрад ці ў тым свеце яна трапляе ў добрае месца, калі нават пасля смерці пераследуе і спакушае жывых.

У Чайкоўскага атрымалася свая «Пікавая дама», нават па сюжэце шмат у чым адрозная ад пушкінскай аповесці. Але містыкі хапае — не толькі сюжэтнай. Ёю прасякнутая найперш музыка (некаторыя партыі сталі нават папулярнымі за доўгі час паспяховага існавання на сцэне гэтага твора). Містычны дух павінна была перадаць рэжысёрская канцэпцыя.

— Наша ідэя палягае на трох картах: тройка сямёрка, туз. Як каханне, жыццё, смерць, — тлумачыць рэжысёр-пастаноўшчык Пламен Карталаў, дырэктар Сафійскага тэатра оперы і балета. — Вар'яцкая гісторыя Германа прасякнута містыкай. І для мяне як для рэжысёра было важна дасягнуць спалучэння з музыкай Чайкоўскага, які, як чараўнік, малюе партрэты на сцэне. І наша дзея, наша таямніца заснаваная на партрэтах, што ствараюць салісты сваімі галасамі. Больш важная псіхалогія, характар, які нарадзіўся і развіваўся на вачах, дзіўная шызафрэнічная атмасфера, таму што Герман — прадукт сваіх сяброў. Яму кажуць: «Ты хворы, ты дзіўны...» І ён спачатку не прымае, але потым пагаджаецца: «Я хворы, я дзіўны...» Ён шукае сваё каханне — і вось яно. Але ёсць другі бераг — багацце. Ён хацеў бы ўзяць багацце праз таямніцу трох картаў. І ён прайграе сваё каханне, як карту, графіні і самому сабе. Нам хацелася падкрэсліць умоўнасць таго, што адбываецца: рэальнасць і ірэальнасць, рацыянальнасць і ірацыянальнасць. Хачу выказаць маё задавальненне ад вашых цудоўных артыстаў, таму што дзякуючы ім увасабленне канцэпцыі атрымалася не сумным.

У гэтым, дарэчы, таксама ёсць пэўная заслуга рэжысёра, якога запрасіла да працы над «Пікавай дамай» пасля паказу ў Мінску «Зігфрыда» Рыхарда Вагнера трупай Сафійскага тэатра. Той спектакль будзе доўга помніцца мінскай публіцы, таму што надзвычай працяглую (каля 5 гадзін) оперу слухалі на адным дыханні. Опера Пятра Чайкоўскага «Пікавая дама» — твор таксама маштабны. Містыка з музыкай — само па сабе добрае спалучэнне, каб заінтрыгаваць слухача і трымаць яго ўвагу, але доўгі твор патрабуе ўнутранага руху ў самой пастаноўцы. Рэжысёр яго ўбачыў у развіцці саміх характараў. Напрыклад, адна з выканаўцаў ролі Лізы, заслужаная артыстка Беларусі Ніна Шарубіна (прызначаны яшчэ Настасся Масквіна, Таццяна Гаўрылава, Кацярына Галаўлёва), прызналася: «Партыя патрабуе шмат эмоцый. Цяперашняя Ліза — вельмі жывы чалавек, у ёй умяшчаецца бура страсцяў. Усё гэта трэба перадаваць голасам, без залішняй тэатральнасці. Наогул у гэтай оперы цяжкая музычная частка. Але такія творы ў рэпертуары павышаюць статус тэатра».

Фота Міхаіла НЕСЦЕРАВА.

Аднак адзін з выканаўцаў партыі Германа, народны артыст Беларусі Сяргей Франкоўскі (акрамя яго партыю спяваюць Эдуард Мартынюк і малады Васіль Мінгалёў), падзякаваў рэжысёру за тое, што ён пры выкананні псіхалагічных задач не парушаў оперныя каноны.

Так і ёсць: мы бачым усё ж класічную пастаноўку — гэта падкрэсліваюць касцюмы герояў (чамусьці здаецца, што гэта людзі з розных часовых прамежкаў), палацавы антураж (у нейкіх сцэнах) і нават сапраўдны выхад у ложу імператрыцы Кацярыны (Чайкоўскі перанёс дзеянне оперы ў яе эпоху). Але вышэйзгаданая рэжысёрам умоўнасць у нейкіх момантах праступае праз сцэнічны гістарызм (мастак-пастаноўшчык Аляксандр Касцючэнка) у больш абстрактных дэкарацыях: такім чынам, ёсць і вобраз Пецярбурга, і адчуванне ўнутраных пакут Германа, і чорны свет, куды ён сыходзіць. На дзіва, усе эпізоды, дзе прыбрана сцэнічная пышнасць, аказаліся спалучальнымі з містычным гучаннем сюжэту і музыкі. Можа, таму, што выкананы ў стрыманых цёмных колерах? Вось дзякуючы ім і разумееш, наколькі сапраўды тры карты могуць пагубіць чалавека, прычым незалежна ад таго, у якую эпоху ён жыве.

Тройка, сямёрка... І дама пік, якая падміргвае — Герману. Але, можа быць, не толькі яму? Мы не бачым. І не адчуваем, што яшчэ неками. І не ўпэўнены. І для нас гэта гісторыя найперш Германа, які сыходзіць у чорнае, і Лізы, якая таксама там. Чаму яна — таксама загадка, бо, здаецца, істота з чыстай душой, у адрозненне ад Германа і графіні.

Старая графіня ў выкананні Наталлі Акінінай (яшчэ партыю спяваюць Алена Сала, Крыскенція Стасенка, Марына Аксёнцава) атрымалася ракавой жанчынай. Наталля Акініна прызналася: «Я сама гуляла ў казіно: выйгравала і прайгравала... Калі мы сустракаемся з графіняй, яна ўжо амаль мёртвы чалавек, таму што прадала душу д'яблу. Ёй патрэбен нехта, каб перадаць свой сакрэт. У Германе яна бачыць пераемніка. Чаму ж тады падманвае? А таму, што д'яблу верыць нельга...»

Ларыса ЦІМОШЫК

■

Андрэй ГАЛАНАЎ, дырыжор-пастаноўшчык:

— Для любога тэатра, асабліва на постсавецкай прасторы, «Пікавая дама» нават сярод опер Чайкоўскага стаіць асобна. Не таму, што напісана кампазітарам на адным дыханні (за 44 дні. — **Аўт.**). Яна хоць і не апошняя опера, але лічыцца вяршыняй опернай творчасці, таму што настолькі тэатральная, у адрозненне ад аповесці Пушкіна, і вельмі складаная. Здавалася б, ну што яе паставіць, калі не трэба нічога прыдумляць (што тычыцца музычных характарыстык герояў), калі ўсё на паверхні, усё зразумела? У тым, што ўсё на паверхні, і заключаецца складанасць. Вядома, без уліку традыцыі гэтая опера не можа ставіцца. У аўтара ёсць 3 рэдакцыі клавіра і 2 рэдакцыі партытуры з яго рэмаркамі, праўкамі, са зменай тэкстаў, з купюрамі. Трэцяя рэдакцыя існавала, але яе так і не выдалі, таму мы можам толькі здагадвацца, якая яна была. Супастаўляючы ўсе нотныя першакрыніцы, трэба было знайсці першапачатковы замысел кампазітара і адрозніць яго ад пажаданняў пастаноўшчыкаў, людзей, з якімі ён непасрэдна працаваў. Мая задача была вярнуцца да першакрыніцы, да таго, чаго хацеў кампазітар. Для мяне першакрыніцай стала першая рэдакцыя твора, якая была выдадзена. Мы прыйшлі да яе, вывучыўшы ўсю перапіску Чайкоўскага таго перыяду (яна шматлікая) і разумеючы недзе падтэкст, які быў неабходны, і цэнзуру гэтых лістоў. Але нават з першакрыніцы ў нас ёсць купіраваныя сцэны. Гэта не тычыцца вялікіх сцэн. Мы ведаем, што ў эстэтыцы таго часу опера не магла ісці без балетных сцэн. У Чайкоўскага ў 3-й карціне ў балі ёсць балетны дывертысмент, ёсць балетныя нумары, якіх вы не ўбачыце. У нас хор фактычна выконвае функцыі балета. Але, верагодна, мы знайшлі свой погляд на традыцыі. Таму, можа быць, нашым слухачам будзе падавацца ў нечым новае прачытанне, але штосьці здасца звыклым.

■ Будзь у форме

ЗРОБІМ ГЭТА ПА-ХУТКАМУ

«Яндэкс» склаў спіс самых папулярных дыет у беларускіх інтэрнэт-карыстальнікаў

Узначаліла рэйтынг дыета Дзюкана, паведамляе прэс-служба кампаніі «Яндэкс», спасылаючыся на вынікі аналізу запытаў аб пахудзенні. Дарэчы, пошукавых запытаў аб рэцэптах і гатаванні розных страў «Яндэкс» атрымлівае ў 4,5 раза больш!

У тройку самых папулярных таксама трапілі грэцкая і японская дыеты. Беларусаў таксама цікавяць сістэма пахудзення «Магі», «крамлёўскі метад» і сістэма «6 пялёсткаў». Менш запатрабаваныя метад Алены Малышавай, бялковая і кефірная дыеты.

Цікава, што кожны пяты запыт пра дыеты робяць мужчыны. Праўда, мужчыны часцей за жанчын пытаюцца пра «крамлёўскую» дыету і метад Алены Малышавай. Жанчыны цікавяцца грэцкай дыетай і «Магі».

Самая вялікая цікавасць да такой тэмы назіраецца ў студзені-лютым, акурат пасля навагодніх бясед. Кожны тыдзень беларусы робяць амаль 75 тысяч запытаў, якія датычацца розных спосабаў пахудзення. Большасць карыстальнікаў цікавяцца дыетамі. На другім месцы — практыкаванні і трэніроўкі, на трэцім — медыцынскія прэпараты. Карыстальнікі «Яндэкса» разглядаюць варыянты бегу, аэробікі, дыхальнай гімнастыкі, таблетак, спецыяльных прылад, содавых ваннаў, абгортванняў, ёгі, танцаў і нават мантраў.

Цікавасць да новых экзатычных спосабаў барацьбы з лішняй вагой хутка ўзрастае і гэтак жа хутка праходзіць. Так, летась сярод самых папулярных запытаў з'явіўся «25-ты кадр для пахудзення». Таксама беларусаў хвалявала, як пахудзець з дапамогай актываванага вугалю. Сёлета цікавасць да гэтых метадаў значна ніжэйшая.

Акрамя спецыяльных дыетычных сістэм, карыстальнікі цікавяцца, як пахудзець з дапамогай асобных прадуктаў. Часцей за ўсё запытваюць пра імбір, зялёную каву і ягады гаджы. Калі чай і імбір папулярныя апошнія некалькі гадоў, то цікавасць да памянёных ягад з'явілася толькі сёлета. Выйшлі з моды папулярныя раней сачавіца, яблычны воцат, клятчатка, ананас.

Прыкладна ў 5 працэнтах запытаў аб тым, як пахудзець, указваюцца канкрэтныя тэрміны. Лідзіруюць і ў жанчын, і ў мужчын «10 кг за тыдзень», на другім месцы — «5 кг за тыдзень», на трэцім — «10 кг за месяц». У кожным 70-м запыце сустракаецца слова «хутка».

Часцей за ўсё пра метады пахудзення пытаюцца ў Віцебскай вобласці, радзей за ўсё — у Гомельскай.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПАХУДЗЕЦЬ ЗА 9 ДЗЁН?

МОЖНА, АЛЕ АСЦЯРОЖНА

Мы можам вельмі доўга супакойваць сябе тым, што «вось з панядзелка» або «з заўтрашняга дня», або «пасля водпуску» (патрэбнае падкрэсліць) пачнём, нарэшце, барацьбу за бездакорнасць сваёй фігуры. Але прыходзіць такі дзень, калі разумееш — часу для разварушвання больш няма. Пачынаць худзець трэба ўжо сёння, каб да «даты ікс» займець ранейшыя формы і ўлезці ў любімую (але пакуль цесную) сукенку. Зразумела, што за дзень скінуць лішак, які вы наядалі доўгі час, не атрымаецца. Ды і за два — тры дні таксама. Аднак пры пэўных намаганнях з парай-тройкай кілаграмаў можна развітацца за 9 дзён. Як гэта зрабіць правільна?

Усе стравы падчас 9-дзённага пахудзення варта ўжываць без спецый, солі і цукру. Што да вадкасці, то ў дзень трэба выпіваць не менш як 2–2,5 літра негазаванай чыстай вады або зялёнай гарбаты, прычым 250 мл пажадана выпіць за паўгадзіны да ўжывання ежы — гэта дапаможа значна знізіць апетыт. А вось пасля яды вадкасць не рэкамендуецца піць на працягу адной гадзіны.

Важна, што падчас дыеты ў меню ўводзяцца зусім розныя прадукты. Рыс, як вядома, змяшчае шмат вугляводаў; курынае мяса — гэта крыніца бялку, а гародніна, якую вы ясце заключныя тры дні, шчодра дзеліцца з вамі вітамінамі і клятчаткай. І яшчэ: эфект ад дыеты будзе больш адчувальным, калі на працягу ўсіх дзевяці дзён не зніжаць, а павялічваць фізічную актыўнасць. Паўгадзінная прагулка пасля працы, паход з дзецьмі ў басейн і простая вылазка ў бліжэйшы парк дапамогуць вашаму арганізму вызваляцца ад лішкаў больш актыўна.

I ЭТАП

Першыя 3 дні ўжываем толькі рыс і ваду.

На адзін дзень вам спатрэбіцца 250 г рысу.

Што робім:

Порцыю рысу з вечара заліваем халоднай вадой. Раніцай адкідваем на друшляк або сіта і старанна прамываем пад праточнай вадой. Наша задача — змыць з круп крухмал. Затым перакладваем у каструлю, заліваем кіпенем і варым 10–15 хвілін. Гатовы рыс дзелім на 5–6 роўных частак і ядзім на працягу дня. Апошняя порцыя павінна быць з'едзена да 19.00. Паралельна п'ем ваду. Прычым яе, гэтаксама як і рыс, трэба размяркоўваць раўнамерна, не дапускаючы вялікіх аб'ёмаў вадкасці ў вячэрні час. Так, пасля 7–8 гадзін вечара ў вас павінна застацца не больш чым шклянка вады.

Тое ж паўтараем на 2-і і 3-і дзень.

Калі вам моцна захочацца салодкага, можна выпіць кубак гарбаты з лыжачкай мёду. Але гэта дазваляецца рабіць толькі раз на дзень!

II ЭТАП

Наступныя 3 дні — у меню мяса птушкі.

На адзін дзень спатрэбіцца: курыная тушка вагой да 1–1,2 кг.

Што робім:

Тушку ачышчаем ад скуркі і тлушчу, затым адварваем. Раніцай спачатку выпіваем шклянку вады, затым з'ядаем 1 ножку і частку курынай грудкі. Гэта складзе прыкладна пятую частку ўсёй тушкі. Астатняе мяса аддзяляем ад касцей, абавязкова змешваем белае мяса з ружовым і, падзяліўшы на роўныя часткі, даядаем на працягу дня. Памятаем: апошні прыём ежы павінен быць не пазней чым у 19.00.

Паралельна не забываем піць ваду.

Тое ж меню на 5-ы і 6-ы дзень.

III ЭТАП

Апошнія 3 дні ў вашым рацыёне агародніна, свежая і вараная. Дзённая норма яе па аб'ёме павінна складаць прыкладна 800-грамовы слоік.

Што робім:

Палову агародніны здрабняем, тушым або адварваем. З астатняй гатуем салату-«шчотку»: бярэм бурак, моркву, некалькі лістоў белакачаннай капусты, трохі свежага зяленіва. Агародніну надзіраем на буйной тарцы, капусту і зяленіва дробна наразаем. Затым усё змешваем, запраўляем аліўкавым алеем, пырскаем лімонным сокам, дадаем сталовую лыжку вады (каб салата была сакавітай). Тушаную агародніну і салату дзелім на роўныя порцыі. На працягу дня чаргуем гэтыя стравы.

Такое ж меню і на 8–9 дзень.

Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ

■

Парады дыетолага

1. Перад тым, як пачынаць хуткую дыету, абавязкова пракансультуйцеся з урачом. Катэгарычна забараняецца экстрэмальнае пахудзенне людзям з хранічнымі або вострымі захворваннямі. Таму, калі ў вас ужо нейкі час «штосьці ные ў баку» або «прабіў насмарк», дыету давядзецца адкласці, пакуль не падлечыцеся.

2. Экспрэс-дыеты супрацьпаказаны падчас цяжарнасці і грудного кармлення дзіцяці.

3. Калі дыета вам патрэбна толькі для таго, каб адзін раз зрабіць уражанне, а потым зноў махнуць на сябе рукой і пачаць есці ўсё без разбору, лепш не пачынайце. Бо дыета — гэта не панацэя ад лішняй вагі, а ўсяго толькі штуршок да яе зніжэння. Таму ў далейшым, каб замацаваць вынік, вам заўсёды трэба будзе, што называецца, трымаць сябе ў руках. А ў адваротным выпадку лішнія кілаграмы хутка вернуцца на сваё месца, а з імі гарантавана расчараванне і яшчэ адзін сур'ёзны стрэс.

4. «Залпавае» зніжэнне вагі — сур'ёзны стрэс для арганізма. І звяртацца да гэтага метаду часцей, чым раз на год, не рэкамендуецца.

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар часопіса
«Маладосць»

ПРАФЕСІЯНАЛЫ І СЕТКІ

Адзін чалавек, даволі вядомы і сур'ёзны, паважны, да таго ж, можна сказаць, калега, бо таксама галоўрэд (не менш прэстыжнага і слаўнага выдання), ніяк не можа атрымаць ад мяне згоду на сяброўства ў сацсетцы. Чаму? Між іншым, ён не адзін такі. Некалькі працоўных раніц на тыдзень пачынаюцца ў мяне з клапотнай (марнатраўнай — больш трапна сказаць) працэдуры выдалення з паштовай скрыні лістоў сумніўнага (з пункту гледжання асабіста майго бачання суб'ектыўнай рэальнасці) зместу: «Запрашэнне ад карыстальніка (імя-прозвішча ў назоўным склоне!) чакае вашага адказу».

